


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

КАНСТАНЦІН САЛАВЯНЮК ☞ 4



http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 32 (2569) Год L | Беласток, 7 жніўня 2005 г. | Цана 2,00 зл.


*Б. Дрвескі: У Францыі Беларусь гэта нейкая Расія, адно што белая, і невядома чаму. Таксама польская эміграцыя — не беларускатворчая, бо спасылаецца на ўласныя крэсавыя сантыменты...*

# Трыялогі ў Лапічах



**Сітуацыя вакол Саюза палякаў Беларусі лягла ценем таксама на сёлетніх літаратурных Трыялогах, арганізаваных Згуртаваннем Villa Sokrates і ягоным духовым бацькам Сакратам Яновічам. У агратурыстычнай гаспадарцы ў Лапічах непадалёк ад Крынак аднак не засланіла яна размоў прысвечаных галоўным чынам беларускай літаратуры ў свеце і сусветнай па-беларуску і ўвогуле культуры.**

Госці Villi пачыналі кожны з чарговых дзён дыскусій ад перагляду друку і публікаваных у ім інфармацый з Беларусі і рэакцый Варшавы. У першы дзень у Лапічах з'явіліся Дабеслаў Жэменеўскі ды Збігнеў Кшывіцкі, старшыня падляшскага самаўрадавага сейміка.

— Цяжка сабе ўявіць Рэч Паспалітую без меншасцей, без традыцыі, якую яны нясуць, без беларусаў, — казаў прадстаўнік МУСіА.

— Кожная меншасць такая, які да яе стасунак з боку большасці, — тлумачыў гаспадар. — Я мог бы быць сто разоў палякам. Не патрабую, аднак, ад польскай дзяржавы, каб мне плаціла пенсію за беларушчыну. Аб нацыянальнасці вырашае лёс. Чым больш польскі шавінізм, тым больш шавінізм беларускі.



С. Яновіч — гаспадар „Трыялогаў”

Аб моцнай тэндэнцыі да спалучэння Беларусі з Расіяй успомніў Рышард Радзік з Люблінскага універсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай:

— Эканамічная сітуацыя для беларусаў значна важнейшая, чым незалежнасць. Шмат людзей пазбягае адказу на такія пытанні, паколькі ў іх слабое пачуццё нацыянальнасці.

Пераконваў ён, што ў Беларусі відаць паніжэнне падтрымкі для адраджэння СССР, паколькі пануе перакананне, што і так ён вернецца, і СССР будзе заменены Расіяй. Што цікавае, з навуковых даследаванняў вынікае, што за інтэграцыяй з Еўрасаюзам выказваецца рускамоўнае насельніцтва.

Амаль трыццацігадовы Фелікс Акерман з Нямеччыны захапіў сваімі спелымі роздумамі аб архітэктанічных зменах сучаснага і даваеннага Гродна, а за імі і ментальнымі зменамі ў гродзенцаў. Тым пытанням прысвячае ён сваю доктарскую дысертацыю. Алесь Белы з Беларусі і Алег Латышонак з Польшчы разважалі аб праблеме фармавання вянгерска-беларускіх кантактаў, як аказалася, значна бліжэйшых у шматвяковай гісторыі, чым звычайна здаецца.

Лаёш Палфолві з Венгрыі параўноўваў прозу беларускага пісьменіка Адама Глёбуса і вянгерскага аўтара Жольта Ланга ды розніцы іх меншаснага пачуцця.

— У Венгрыі пануе правы стэрэатып меншаснага пісьменніка, — дадаў ён.

Незвычайна цікавыя роздумы і інфармацыі прагучалі з вуснаў прафесара Бруна Дрвескага з Парыжа, які займаецца распаўсюджваннем у Францыі ведаў аб беларускай культуры і Беларусі ўвогуле. Быў ён у першай палове дзевяностых гадоў аўтарам першай гісторыі Беларусі па-французску. Пазней выдаў кнігу прысвечаную беларусам у даваенным польскім парламенце. Гаварыў ён, што веды французаў, нават журналістаў, аб Беларусі ў Францыі амаль ніякія. Мае гэта адбітак нават у лексіцы, дзе не адрозніваецца Расія ад Беларусі:

— У Францыі Беларусь гэта нейкая Расія, адно што белая, і невядома чаму.

Таксама польская эміграцыя — не беларускатворчая, бо спасылаецца на ўласныя крэсавыя сантыменты.

І зазначыў:

— Гаворыцца, што Беларусь адстае хоць бы па прычыне неразбуджанай нацыянальнай свядомасці. У працэсе глабалізацыі, аднак, тоеснасць толькі тэрытарыяльная, як на Беларусі, і гэта мае будучыню. Такія тэндэнцыі пачынаюць панаваць у Еўропе.

Язэп Янушкевіч з Ракава ў Беларусі пераконваў да ўрачыстага адсвяткавання двухсотгоддзя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, аднаго з галоўных стваральнікаў сучаснай беларускай мовы і беларускага пісьменства, аўтара польска-беларускага пагранічча. Гэта, аднак, сустракаецца з праблемамі з боку адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі.

Урэшце сваю сувязь з Нараўкай, Белавежскай пушчай і беларушчынай падкрэсліў адзін з братоў Кабацоў — пісьменнік Яўген Кабатц, былы сакратар Яраслава Івашкевіча, культурны аташэ польскага пасольства ў Рыме. Ён — аўтар перакладу ўжо ў 1979 г. „Трэцяй ракеты” Васіля Быкава.

Сёлетнім Трыялогам прыслухоўваўся Антон Марыя Рафо з Фларэнтыйскага універсітэта. Спадарожнічалі ім выстава Віктара Кабаца „Курапаты — наша сумленне, наш боль” (аб ёй больш у наступным нумары „Нівы”) ды канцэрт гродзенскага барда Віктара Шалкевіча.

Традыцыйна тэксты дакладаў будуць надрукаваны ў часопісе Villi Sokrates „Annus Albaruthenicus — Год Беларускі”.

**Тэкст і фота Мацея Халадоўскага**

## Усе ў Гродна

☞ 2

Яўген Вапа

*Кожны, хто хоча выявіцца ў польскай палітыцы або дзяленні грошай, абавязкова паедзе з вельмі важнымі прапановамі ў Гродна. Большасць з іх цягам апошніх гадоў з вялікай пашанай падтрымоўвала няслаўнага зараз Кручкоўскага, які ў адкрытую ў польскіх СМІ не прызнаваў ані беларускага народу, ані яго дзяржаўнасці. Усе маўчалі...*

## Акт лаяльнасці?

☞ 2

Мікола Ваўранюк

*Як вы можаце патрабаваць ад польскіх грамадзян публічнага асуджэння дзеянняў Лукашэнкі? Толькі таму, што яны беларускай нацыянальнасці? Гэта мае быць акт лаяльнасці да польскай дзяржавы ці што? Як вам увогуле прыйшло ў галаву супаставіць польскіх беларусаў з тым, што якраз адбываецца з Саюзам палякаў у Беларусі...*

## Да каранёў

☞ 8

Аляксей Мароз

*— Вельмі цікава збіраць фальклорныя песні і займацца працай, якой раней амаль ніхто ў нас не рабіў. Ёсць нагода вяртацца да нашых каранёў, — сказала Даша Сідарук з Высокага. — Калі б была магчымасць, мы хацелі б збіраць фальклорныя песні таксама на вашым баку мяжы.*



*Дзяўчаты запісвалі песні ў Бобінцы і бачылі хаты распаложаныя ў Польшчы, якія да ўстанаўлення дзяржаўнай мяжы належалі да вёскі Бобінка. Хацелі б яны, каб мяжа не была перашкодай у іх працы...*

## Сяброўская бяседа

☞ 9

Міра Лукша

*Сёння на „Сяброўскай бяседзе” выступіць каля сарака калектываў з Польшчы, шэсць з Беларусі і адзін з Украіны. Усё пад выбухі феерверкаў, пры пячэнні парасят, на ўквечанай сцэне, са сталом, дзе расселіся нашы прыгажуні-мастачкі роднай песні, з гасцінцамі ад калектываў ды сталамі, які ўгнуцца ад багатага пачастунку. Нішто так не яднае людзей як бяседа...*

**Спасаўскія запусты**

*7 жніўня 2005 г., 16[00] гадз., гарадскі амфітэатр у Бельску-Падляшскім*

9 770546 196000



# Памятаем пра Вас

*Найважнейшае добра выбраць. Мелі інтуіцыю ўдзельнікі шостага з'езду Саюза палякаў Беларусі, калі дэмакратычным шляхам старшынёй сваёй арганізацыі абралі Анжаліку Борыс. Нікому тады не ўяўлялася, якія выпрабаванні чакаюць яе і новае, легальнае кіраўніцтва арганізацыі. І, здаецца, мае рацыю Уладзімір Хільмановіч, які ў адным са сваіх фельетонаў на старонках „Нівы" апавясціў, што надзея беларускай палітыкі — гэта жанчыны. Калі глядзім на фотарэпартажы з Беларусі, дык гэта маткі і жонкі загінуўшых беларускіх палітыкаў, журналістаў рэальна не даюць спакойна спаць уладам. То вось у большасці жанчыны дзяжурылі ў абароне сядзібы Саюза палякаў у Гродне. Гэта на долю, гонар і годнасць Анжалікі Борыс сёння выпадае супрацьстаянне фальшу, непраўдзівым абвінавачванням з боку дзяржаўных структур і часткі суродзічаў-палякаў. І — маючы ўпэўненасць у сваіх юрыдычных і маральных рацыях — раптам можна стаць ахвярай ці заложнікам звышпалітычных гульняў. Добра мы, беларусы ў Польшчы, спазналі такое. Ведаем і памятаем, хто з'яўляецца сапраўдным сябрам, а хто толькі звычайным правакатарам. І калі ў абарону „Нівы" падпісаўся ганаровы старшыня Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін (а мясцовая беластоцкая палітычная, культурна-навуковая эліта не заікнулася ні словам) — гэта было ўзаемазразуменне долі і нядолі быцця нацыянальнай меншасцю, бо ніхто лепей не разумее нашай сітуацыі і рэальных праблем чымсьці мы самі — беларусы Беласточчыны і палякі Гродзеншчыны. Самае горшае ў тым, што надалей за нас вырашаюць, што для нас лепшае, як маем сябе паводзіць, што трэба гаварыць уладам і прэсе. Абавязкова дзякуючы прытым за тое, што мы жывем. Таму, спадарыня Анжаліка Борыс трымайцеся! Дзеля будучыні трэба ствараць новую якасць нармальнасці быцця нацыянальнай меншасцю, асабліва на сумежжы, як паўнапраўных грамадзян нашых Айчын, у якіх жывем, выконваючых належныя абавязкі, але ўмеючых карыстацца законамі. Дзе толькі можна будзем сваім голасам гаварыць пра свае справы. Вядома, на дарозе да нармальнасці чакае шмат перашкод. Заўсёды і ў нас, і ў вас знойдуцца прадажныя людзі, якія за любую цану гатовыя служыць кожнай уладзе. Вядома, са стратай для нас, меншасцяў.*

*Народная беларуская прымаўка кажа: „Калі паны б'юцца, мужыкам галовы трашчаць". Палякам у Беларусі зараз прыйшлося атрымаць такі ўдар. У такой сітуацыі цяжка спадзявацца ім на выйгрыш. Але неабыякавай да лёсу польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі засталася дэмакратычная супольнасць краіны. А гэта абнадзейвае. Нягледзячы на сённяшняе становішча, у будучым беларуская дзяржава будзе роднай айчынай для беларусаў, палякаў, расіян, літоўцаў, яўрэяў, украінцаў і іншых меншых народаў. А сённяшнія польскія палітыкі, калі гавораць пра сваю падтрымку для польскай меншасці, не павінны забываць, што... толькі існаванне незалежнай беларускай дзяржавы будзе найлепшай парукай для правоў усіх мяншынь. А гэтай асноўнай праўды ў сваім вербальна-медыяльным выбарчым экстазе, здаецца, не памятаюць народныя абраннікі. Цягам бліжэйшага часу кожны, хто хоча выявіцца ў польскай палітыцы або дзяленні грошай, абавязкова паедзе з вельмі важнымі прапановамі ў Гродна. Большасць з іх цягам апошніх гадоў з вялікай пашанай падтрымоўвала нясляўнага зараз Кручкоўскага, які ў адкрытую ў польскіх СМІ не прызнаваў ані беларускага народу, ані яго дзяржаўнасці. Усе маўчалі, а палітыкі, навукоўцы і журналісты не пратэставалі супраць такога разумення польска-беларускіх суадносін. Абсалютна разумею выказванні і адчуванні старшыні Саюза палякаў Беларусі Анжалікі Борыс наконт таго, чым найлепей ім дапамагчы ў такой сітуацыі, калі яна гаворыць: памяццю пра нас. Не ведаю як іншыя, але „Ніва" пра Вас помніць.*

**Яўген Вапа**

# Калектыўная адказнасць?



*Прафесар Цэзары Куклё, сорам! Сорам на вас і вашых калег з беластоцкага аддзела Польскага гістарычнага таварыства!*

*Як вы можаце патрабаваць ад польскіх грамадзян публічнага асуджэння дзеянняў Лукашэнкі? Толькі таму, што яны беларускай нацыянальнасці? Гэта мае быць акт лаяльнасці да польскай дзяржавы ці што? Як вам увогуле прыйшло ў галаву супаставіць польскіх беларусаў з тым, што якраз адбываецца з Саюзам палякаў у Беларусі?*

*Прафесар Куклё, ад вас, як кіраўніка Інстытута нацыянальнай памяці ў Беластоку, чакаў бы я хутчэй іншага заклiку. Да дзяржаўных улад, праваабарончых органаў, палітычных партый, каб зрабілі ў гэты момант усё дзеля стрымання нацыяналістычнай рыторыкі ў адносіных да беларускай меншасці ў Польшчы. Каб ніхто ў Польшчы не спрабаваў рэваншу на польскіх грамадзянах беларускай нацыянальнасці за тое, што робіць Аляксандр Лукашэнка са сваімі грамадзянамі (не толькі польскага паходжання). Асабліва цяпер, калі ў выбарчай кампаніі лёгка даюцца папулісцкія лозунгі. У Польшчы ж не звяліся сілы, якія ніколі не грэбавалі неталерантнасцю, ксенафобіяй, дзікім нацыяналізмам дзеля сваіх палітычных мэтаў.*

*Замест заклiку, які б меў на мэце стрымаць тыя сілы, небяспечныя рэакцыі, вы ставіце Богу вінную жменьку жыхароў Падляшша ў ролі заложнікаў палітыкі Лукашэнкі. Ці ж не сорам?*

*Калі на хвалі абурэння, якое пракацілася ў апошніх днях па Польшчы, захацелі і вы падаць свой голас, то ці не лепш было звярнуцца да тых, хто спрычыніўся да такой сітуацыі? Чаму вы не асуджаеце Сенат Рэчы Паспалітай, Wspólnotę Polską і Міністэрства замежных спраў за тое, што гадамі супрацоўнічалі з Тадэвушам Кручкоўскім — маральным балотам, як мне казалі гродзенскія палякі, калі ён яшчэ быў пры ўладзе і не паказаў навонкі ўсіх сваіх талентаў. Усе верылі Кручкоўскаму, што ён вядзе Саюз палякаў здалёк ад палітыкі, што Саюзу пагражаюць беларускія нацыяналісты з Беларускага народнага фронту і асабіста Зянон Пазьняк, які, парадаксальна, амаль дзесяць гадоў жыве ў Варшаве.*

*Польшча не хацела разумець праблемаў палякаў у Беларусі. Усім адпавядала дзейнасць Wspólnoty Polskiej і розных дабрачынных арганізацый, якую заснавальнік і шматгадовы старшыня Саюза палякаў на Беларусі Тадэвуш Гавін назваў палітыкай снікерса. Лепш раз завезці калядныя пачкі ў ролі Святога Мікалая, чым доўга пазнаваць спецыфіку Беларусі і дапамагаць тамтэйшым палякам хаця б адукацыяй. А найлепш высылаць заржавелыя конныя касілкі, паношаную вопратку і кніжкі, па якія не працягнецца ў Польшчы ніводная дзіцячая рука.*

*Прафесар Куклё, калі вам не падабаюцца пахвалы рэжыму Лукашэнкі з вуснаў старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства Яна Сычэўскага (апалітычнага ў той жа ступені, што і Кручкоўскі), то звяртаецеся не па тым адрасе. Пішыце кіраўнікам СЛД — партыі, якая паставіла яго на кіраўнічую пасаду ў ваяводстве і рыхтуе яму дэпутацкае месца ў Сейме. Спытайцеся маршалка таго ж Сейма і, магчыма, будучага прэзідэнта Владзімежа Цімашэвіча, ці яму такія словы не колюць у вушы? Але не шукайце калектыўнай адказнасці. Не рабіце з мяне — беларуса, грамадзяніна Польшчы — казла адпушчэння.*

*Трэба ведаць калі адазвацца і што казаць. Калі няма чаго, лепш маўчаць. Маўчанне прынамсі нікому не прынясе шкоды.*

**Мікола Ваўранюк**



Mniejszości narodowe są szczególnie wrażliwe na los mniejszości w innych krajach. Zwracamy się zatem z apelem do organizacji białoruskich w Polsce o zajęcie stanowiska wobec działań podejmowanych przeciwko Związkowi Polaków na Białorusi oraz zarzutów formułowanych przez przedstawicieli rządu Republiki Białoruś przeciwko Polsce. Potwierdźmy w praktyce, czy faktycznie istnieje „Droga do wzajemności".

Prezes Oddziału PTH w Białymstoku prof. Cezary Kuklo

Фрагмент „заклiку да лаяльнасці", які паступіў у нашу рэдакцыю 28.07.2005 г.

# ЗАЯВА

*Ад імя дэмакратычных партыяў і арганізацыяў, усяе дэмакратычнае грамадзкасьці Беларусі мы выказваем рашучы пратэст супраць уламаньня АМАПу, міліцыі й спэцслужбаў у будынак Саюзу палякаў на Беларусі (СПБ) у Горадні, гвалтоўнага затрыманьня законна абранага кіраўніцтва аднае з найбуйнейшых грамадзкіх арганізацыяў Беларусі, засуджэньня трох актывістаў СПБ на адміністрацыйны арышт. Улады не пасаромеліся ўжыць сілу для таго, каб пасадзіць у офісе арганізацыі сваіх стаўленікаў.*

*Паралельна ў сродках масавай прапаганды краіны, у выступах уладных асобаў разгортваецца небясьпечная антыпольская істэрыя, фактычна робіцца спробы распаліць міжэтнічную варожасьць у нашай краіне і ў суседніх дзяржавах, зь віны Менску правакуецца дыпляматычная вайна. Беларусь цягнуць у багну міжнароднай ізаляцыі.*

*Атака на СПБ сьведчыць пра поўную зьнявагу ўладамі волі беларускіх грамадзянаў любой нацыянальнасьці. Менская ўлада перайшла небясьпечную мяжу, за якой няма месца грамадзянскай супольнасьці, народнаму волевыяўленьню, грамадзянскаму спакою. Няма падставаў гаварыць пра „беларуска-польскі" канфлікт альбо супакойліва апісваць абуральныя падзеі як „праблемы двухбаковых адносінаў Беларусі й Польшчы". Ёсьць канфлікт А. Лукашэнкі й ягонай клікі з уласным народам, з суседнімі дзяржавамі й з усім дэмакратычным сьветам.*

*Мы патрабуем безумоўнага вызваленьня затрыманых актывістаў СПБ, вываду сілавых структураў з будынкаў грамадзкай арганізацыі, спыненьня беспрэцэдэнтнага ўмяшаньня ўлады ва ўнутраныя справы самакіравальнага згуртаваньня.*



Леону Падляху парвалі кашулю

*Мы заклікаем дэмакратычную грамадзкасьць Эўропы, нацыянальныя парлямэнты, ўрады, Эўрапарлямэнт, Эўракамісію да адэкватнай ацэнкі апошніх падзеяў у Беларусі. Самаўладзьдзе, якое стварае нестабільнасьць у рэгіёне, не павінна пачувацца беспакараным, гэтаксама як не павінен цярпець пакуты беларускі народ.*

***Аляксандар Бухвостаў, Вінцук Вячорка, Сьвятлана Губейка, Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Мілінкевіч, Уладзімір Навасяд, Павал Севярынец, Мікола Статкевіч***

*Менск, 28 ліпеня 2005 г.*

*Кручкоўскі, які актыўна апошнія гады выказваўся шавіністычна ў дачыненні да беларусаў, зрабіў сенсацыйную заяву. Маўляў, мы ёсць сапраўднымі палякамі, а нашы апаненты — гэта акаталічаныя беларусы...*

# Гэта не канфлікт беларусаў і палякаў

**Падзеі вакол Саюза палякаў у Беларусі апошнім тыднем разгортваліся нібы ў крымінальным баевіку кепскай рэжысуры. Тэлевізійныя агіткі (іх трапна ў народзе называюць „агідкі”) з удзелам найбольш адыёзных асоб з ліку старога кіраўніцтва гэтай арганізацыі былі падмацаваныя ганебнымі дзеяннямі ўладаў, якія ўжо даўно не лічацца з выбарам і сумленнай пазіцыяй людзей.**

26 ліпеня ўвечары ў Шчучыне былі затрыманы трох лідэраў Саюза палякаў Беларусі — Юзаф Пажэцкі, Мечыслаў Яськевіч і Анджэй Пачобут. Усіх іх назаўтра чакаў суд. Абвінавачваліся затрыманыя ў правядзенні ў Шчучыне 3 ліпеня гэтага года несанкцыянаванага пікету. На гэты раз Юзаф Пажэцкі, Мечыслаў Яськевіч і Анджэй Пачобут прыехалі ў Шчучын, каб прысутнічаць у якасці назіральнікаў на чарговым арганізацыйным фарсе былога кіраўніцтва Саюза палякаў. Стары склад Галоўнай рады сабраўся якраз у Шчучыне з мэтай прызначэння даты паўторнага з’езда. 26 ліпеня былы старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі ў будынку польскай школы ў Гродне сабраў сваіх прыхільнікаў з ліку старога складу Управы СПБ і заявіў, што новае кіраўніцтва арганізацыі дажывае апошні дзень. Што азначалі гэтыя словы, стане зразумелым у наступны дзень, але ўжо ўначы ў кватэру дэмакратычна абранай кіраўнічкі Саюза палякаў Беларусі Анжалікі Борыс зноў увварваліся міліцыянты з пагрозамі.

Суд над затрыманымі ў Шчучыне адбыўся ў Лідзе. Відаць, улады імкнуліся схаваць ганебны „судовы працэс” ад міжнародных журналістаў. А можа крыху забракла цынізму. Рэч у тым, што жонка кіраўніка Шчучынскай філіі СПБ Уладзіміра Богдана, які актыўна выконвае загады ўлады і падтрымлівае Кручкоўскага, Тамара Богдан, працуе суддзёй у мясцовым судзе.

За нібы правядзенне 3 ліпеня несанкцыянаванага пікету галоўны рэдактар „Magazynu Polskiego” Анджэй Пачобут засуджаны да 15 сутак адміністрацыйнага арышту, старшыня Гродзенскага гарадскога аддзела Мечыслаў Яськевіч і віцэ-старшыня арганізацыі Юзаф Пажэцкі атрымалі па 10 сутак арышту.

Сябры старога складу Галоўнай рады Саюза палякаў Беларусі, якія з падачы Міністэрства юстыцыі не прызналі вынікаў апошняга з’езда арганізацыі і пераабрання кіраўніцтва, правялі сваё пасяджэнне ў шчучынскім Доме палякаў. Па словах аднаго з удзельнікаў гэтай нарады Канстанты Тарасевіча на пасяджэнні прысутнічала 14 чалавек. Усяго ў складзе папярэдняй Галоўнай рады Саюза палякаў Беларусі было 35 чалавек. Напярэдадні Кручкоўскі разам са сваімі прыхільнікамі выключылі з арганізацыі 8 чалавек разам з Анжалікай Борыс, якая была абрана новай старшынёй СПБ. У Шчучын прыехала 13 чалавек, якія прывезлі яшчэ 5 паперак з так званымі дэлегаванымі галасамі. Тыя, хто сабраўся ў Шчучыне, цвердзяць зараз пра наяўнасць кворуму і легітымнасць пасяджэння. Правядзенне нова



*Актывісты Саюза палякаў моляцца ля будынка адабранай сядзібы*

вага з’езда запланавана на 27 жніўня, вызначана, што ён адбудзецца ў Ваўкавыску. Згаданае пасяджэнне адбывалася пры ўзмоцненай ахове міліцыі і іншых спецыяльных атрадаў, пад’езд да Дома палякаў у Шчучыне фактычна быў заблакаваны. Была часова затрымана група польскіх тэлежурналістаў з канала TVP па прычыне таго, што ў аднай журналісткі не было паперкі пра акрэдытацыю. Таксама на дарозе да Шчучына быў спынены Веслаў Кеўляк, адзін з вядомых актывістаў СПБ.

**Тадэвуш Гавін** (першы старшыня Саюза палякаў Беларусі), які напісаў адмысловую адозву да сяброў арганізацыі, гаворыць:

— Гэта канфлікт паміж палякамі, якія хочуць жыць у прававой дзяржаве і тымі, хто быў прызначаны рабіць „польскі рух”. Улада не хоча прызнаваць абранае дэмакратычна ў выніку патаемнага галасавання новае кіраўніцтва нашай арганізацыі. Не прызнаюць легітымнасць нашага з’езда, а ўсё наадварот — сама гэтая ўлада — мясцовыя саветы, парламент, прэзідэнт — ёсць нелегітымнымі.

Умешванне ўлад у дзейнасць грамадскай арганізацыі Саюза палякаў Беларусі дасягнула свайго апагею ўвечары 27 ліпеня. Каля 22.00 адбыўся гвалтоўны захоп Галоўнай сядзібы Саюза палякаў у Гродне. Якія падраздзяленні сілавых структураў ажыццяўлялі гэтую „аперацыю”, сказаць цяжка, бо нападнікі былі апрануты ў спартовую форму. Кіраўніцтва арганізацыі брутальным спосабам папросту было выкінута з сядзібы. Людзей выцягвалі з будынка і валаклі па зямлі, аднаму са старэйшых сяброў арганізацыі Леону Подляху парвалі кашулю. Такім чынам улады ўвялі ў галоўную сядзібу Саюза палякаў былое кіраўніцтва на чале з Тадэвушам Кручкоўскім. Каля 20 чалавек, сярод якіх і беларусы, былі затрыманы, на міліцэйскіх машынах іх развезлі ў два розныя пастарункі горада. У ліку затрыманых былі таксама некалькі журналістаў, у прыватнасці Вацлаў Радзівіновіч і Роберт Кавалеўскі з „Gazety Wyborczej”. Праз тры гадзіны, каля гадзіны ночы, усіх затрыманых адпусцілі.

Раніцай 28 ліпеня а 9-й гадзіне раніцы каля будынка Саюза палякаў сабралася каля трох дзесяткаў актывістаў арганізацыі, якія выказвалі абурэнне па прычыне такіх гвалтоўных дзеянняў. Уваход у будынак пільна ахоўвалі высокія міліцэйскія чыны, непадалёк стаялі таксама людзі ў цывільным. Старшыню арганізацыі Анжаліку Борыс, якая хацела забраць свае асабістыя рэчы, у памяшканне не пусцілі. „Правільныя” кіраўнікі баяцца выйсці з будынка і паказацца на людзі. А адзін з актыўных „акторау” тэлевізійных ксенафобных праграм, выкладчык Аграрнага універсітэта Вальдэмар Краўцэвіч, які прыйшоў да сядзібы пад воклічы „здрайца”, быў змушаны ратавацца ўцёкамі. Хаця людзі, сярод якіх пераважалі жанчыны сталага веку, не былі настроены агрэсіўна. Прысутныя спявалі рэлігійныя песні і знакаміты гімн „Рота” на верш Марыі Канапніцкай, пасля ўкленчылі і сталі маліцца.



*Анжаліка Борыс перад сядзібай СПБ*

**Анжаліка Борыс** (старшыня СПБ):

— Тыя дзеянні, што зрабіла ўлада — гэта вялікая глупота. Паглядзіце, яна сілай выкінула з сядзібы тых, хто ёй не падабаецца і цяпер некалькі асоб — Кручкоўскага, Знайдзінскага, Краўцэвіча бароніць ад тлуму абураных людзей. Гэта не міжнацыянальны канфлікт, з боку беларусаў да нас няма абсалютна аніякай варожасці. Што будзе далей? Напэўна некаторы час будуць існаваць дзве арганізацыі Саюза палякаў — сапраўдная і марыянеткавая. Але я мяркую, што большасць людзей усё цудоўна разумее, таму наша арганізацыя застанецца жыць і дзеіць.

Галоўны рэдактар газеты „Głos znad Niemna”, выхад якой быў прыпынены (затое супрацьзаконна былі аддрукаваныя некалькі фальшывых нумароў) **Анджэй Пісальнік** так каментуе сітуацыю:

— Ёсць адчуванне татальнага абсурду. Улада выйшла за межы прававога поля, за межы ёй самой усталяванага заканадаўства. Плюс поўная амаральнасць — для купкі „псеўдапалякаў” забіраюць будынак, пабудаваны за грошы польскіх падаткаплацельшчыкаў для польскай меншасці.

З іншага боку Кручкоўскі, які актыўна апошнія гады выказваўся шавіністычна ў дачыненні да беларусаў, зрабіў сенсацыйную заяву. Маўляў, мы ёсць сапраўднымі палякамі, а нашы апаненты — гэта акаталічаныя беларусы.

А 1 жніўня ў панядзелак каля будынка Саюза палякаў у Гродне сабралася каля 120 чалавек. Прадстаўнікі міліцыі палохалі прысутных арыштамі і штрафамі, але ніхто не разыходзіўся. А палове першай дня да будынка прыехаў віцэ-маршалак Сейма Польшчы, лідэр партыі Грамадзянская платформа Дональд Туск. Сярод іншага спадар Туск сказаў:

— Мы выразна ўсведамляем, што гэта не ёсць канфлікт беларусаў і палякаў. У вас забралі сядзібу, але ў кожнага яна застаецца ў сэрцы. Трымайцеся, ніхто ў Польшчы вас ні на хвіліну не забудзе.

Сітуацыя з Саюзам палякаў Беларусі выглядае абсалютна зразумелай і заканамернай. Людзі, якія ўзурпавалі ўладу ў Беларусі, спярша падзялілі тытульную нацыю — беларусаў на „правільных” і „няправільных”. Цяпер чарга дайшла да нацыянальных меншасцяў. Дзяржава татальна і сістэмна сама нахабнымі спосабамі ўмешваецца ў дзейнасць грамадскіх арганізацый і палітычных партый, пазбаўляючы людзей галоўнага права — права выбару.

**Тэкст і фота**
**Уладзіміра Хільмановіча (Гродна)**

## Нараўчанская дэмаграфія

У Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) пражывае каля 4 600 чалавек. Найбольшыя вёскі гэта: Нараўка (пражывае ў ёй 987 чалавек), Семяноўка (483), Старое Ляўкова (404), Новае Ляўкова (248), Скупава (233), Міклашэва (201), Плянта (186), Лешукі (158) і Альхоўка (127).

Доўгажыхарамі Нараўчанскай гміны з’яўляюцца: 104-гадовая Фяўронія Стоцкая з Бярнацкага Моста, 102-гадовы Юзаф Шарэйка з Плянты і 102-гадовая Анна Кісялеўская са Стачка. Роўна 100-гадовай жыхаркай з’яўляецца Яўгенія Аліхвер з Семяноўкі. Праз год па 100 гадоў жыцця будуць мець Вікторыя Сухадола з Міклашэва і Ян Раманчук, які зараз пражывае ў Доме апекі „Ракітнік” у Белавежы (яны нарадзіліся ў 1906 годзе).

Сёлета шэсць пар рыхтуецца адзначыць 50 гадоў сумеснага жыцця.

Нарадзілася 19 дзяўчынак і хлопцаў. Бацькі далі ім імёны: Аляксандра, Юлія, Адрыяна, Дар’я, Блянка ды Давід, Войцех, Кшыштаф, Аляксандр і Рыгор.

**(мох)**

## Запрашэнне

Музей Малой Айчыны ў Студзіводах сардэчна запрашае на канцэрт фальклорна-этнаграфічнай групы „Доброславочка” з Доброслаўкі Пінскага раёна.

Выступленне адбудзецца 5 жніўня (пятніца) у 18 гадз. у пленеры Музея ў Студзіводах. Можна будзе пачуць і пабачыць традыцыйны фальклор Палесся: абрады, песні, танцы. Калектыў захоўвае традыцыйны манер палескага спеву, паказвае старыя танцы: добраслаўскую закрутную, на рэчаньку, лысы, подіспань.

У суботу, 6 жніўня, „Доброславочку” можна будзе пабачыць на этнаграфічным фэстыне ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы (13 гадз.). У нядзелю, 7 жніўня, група выступіць на „Спасаўскіх запустах” у Бельску.

**Дарафей Фіёнік**
**— кіраўнік Музея**

## Конкурс „Маё праваслаўе”

Брацтва праваслаўнай моладзі запрашае да ўдзелу ў фатаграфічным конкурсе на тэму „Маё праваслаўе”. Фотаздымкі павінны ілюстраваць разнародныя праявы жыцця Праваслаўнай царквы (царкоўныя аб’екты і мастацтва, агляды царкоўнай творчасці, удзел духавенства і вернікаў у штодзённым і святочным жыцці Царквы, школьны катэхізіс, паломніцтва).

Кожны ўдзельнік можа выслаць максімальна пяць фотаздымкаў фармату 15 x 21 см, да 30 лістапада 2005 года на адрас: Брацтва праваслаўнай моладзі, 15-420 Беласток, вул. св. Мікалая, 3.

**(мох)**

# Любоў да роднага і гісторыі

*Рашылі мы паставіць памятнік у выглядзе велізарнага каменя з дошкай і датай заснавання вёскі. Аднак паявілася пытанне, як перавезці пятнаццацітонны камень з майго поля ў вёску...*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

**Размова з Канстанцінам САЛАВЯНЮКОМ, солтысам Трывежы і былым радным Гайнаўскай гміны.**

***— Вы сабралі многа гістарычных інфармацый наконт Вашай мясцовасці, яе навакольля і збіраецеся разам з вяскоўцамі святкаваць 365-годдзе існавання вёскі. Дзе Вы знайшлі так дакладныя інфармацыі?***

— Мой сын быў на вяселлі ў Палічнай і там пазнаёміўся з дзяўчынай, што пісала дыпломную работу пра нашу вёску. Яна паінфармавала аб багатым архіве наконт нашых мясцовасцей, які знаходзіцца ў Беластоку. Аднак яшчэ больш інфармацый пра вёску можна знайсці ў дакументах, якія захоўваюцца ў Вільні.

***— Раней гаварылася, што назва вёскі ўзялася ад трох вежаў...***

— Старэйшыя людзі тлумачылі, што ў навакольлі нашай вёскі былі тры вежы, з якіх эканомы наглядалі за працай людзей і ад іх узялося названне. Аднак мы з сынам дайшлі да дакументаў, якія пацвярджаюць дату заснавання нашай вёскі і яе назву. У 1640 годзе Адамам Казаноўскім быў заснаваны каралеўскі фальварак Трывеж, да якога належалі навакольныя вёскі ад Васькоў па Горнае, якое зараз з’яўляецца вуліцай Гайнаўкі.

***— Якія гістарычныя інфармацыі наконт Трывежы захаваліся з пазнейшага перыяду?***

— Пазней землі фальварку Трывеж пераняў пан з Вежанкі. Пасля ў Трывежы пасяліліся жыхары Катоўкі і Навасад з прозвішчамі Пракапюк, Давідзюк і іншыя. Новая вуліца нашай мясцовасці ўзнікла яшчэ пазней. Амаль усе гаспадары выехалі з вёскі ў час бежанства. На месцы засталіся толькі дзве сем’і. У пустых дамах пасялілі рабочых, якія працавалі ў Белавежскай пушчы. Калі нашы жыхары вярнуліся ў вёску, вялікіх знішчэнняў не было. Толькі на палях рос малады лес, які трэба было выкарчоўваць, каб ізноў рабіць у полі. У час другой сусветнай вайны было знішчаных некалькі дамоў, але вёска ўцалела. Героямі сталі некалькі савецкіх салдат, якія прыбыўшы ў Трывежу, пачалі абстрэльваць нямецкія войскі. Яны спынілі артылерыйскі абстрэл нашай вёскі і спрычыніліся да адступлення немцаў.

***— Што вядома пра жыццё ў наваколлі фальварка Трывеж?***

— Побач фальварка Трывеж знаходзілася спіртное прадпрыемства і таму ў наваколлі гаспадары сеялі многа жыта. Вялікай мясцовасцю была Нарва, у якую вазілі збожжа і пазней рэчкай адпраўлялі яго ў Варшаву.

***— Як плануеце ўшанаваць гадавіну ўзнікнення вашай вёскі?***

— Рашылі мы паставіць памятнік у выглядзе велізарнага каменя з дошкай і датай заснавання вёскі. Аднак паявілася пытанне, як перавезці пятнаццацітонны камень з майго поля ў вёску. Паколькі на месцы, дзе стаяў фальварак, зараз знаходзяцца панадворкі, рашыліся мы паставіць помнік побач вясковай святліцы.

***— Ці вядомая ўжо дата святкаванняў?***

— Хацелі б мы наладзіць мерапрыемства ў верасні, але аб канчатковай даце святкаванняў яшчэ вырашым.

***— У наваколлі Вашай вёскі знаходзяцца вялікія залежы гліны. Можа ёсць шанц пабудаваць керамічную фабрыку?***

— Пошукі гліны праводзіліся яшчэ ў 1970-х гадах. Сапраўды, аказалася, што многа яе знаходзіцца ў наваколлі нашай вёскі і можна тут паставіць цагельню, ці фабрыку керамікі. Аднак тады не было падтрымкі з боку ўлад і ніякае прадпрыемства ў наваколлі нашай вёскі не ўзнікла. У васьмідзесятых гадах я цікавіўся гэтай справай у ваяводскай установе і мне сказалі, што ёсць дакументацыя, якая пацвярджае вялікія залежы гліны. Калі я быў яшчэ радным, дабіўся, каб у стратэгію развіцця гміны ўвялі будову побач нашай вёскі керамічнага прадпрыемства. Я асабіста шукаў інвестара, але мае намаганні закончыліся безвынікова. Раней не было ў нашай вёсцы ні добрых дарог, ні тэлефонаў. Зараз інфраструктура палепшылася, але няма інвестараў, якія маглі б выдаткаваць свае сродкі на пабудову прадпрыемства.

***— Вы па прафесіі будаўнік?***

— Спачатку я працаваў у будаўнічых фірмах у Польшчы і Нямеччыне. Пасля заснаваў сваё будаўнічае прадпрыемства „Консбуд”. Пабудаваў я многа дамоў і абораў. Апрача будаўніцтва займаўся таксама гаспадаркай, а апошнім часам — вяду краму ў Трывежы.

***— Якая зараз кан’юнктура ў вясковым будаўніцтве?***

— Па вёсках зараз вельмі мала людзей ставіць новыя дамы. Апошнім часам мы намнога больш працавалі ў гарадах. Зараз дамы на вёсках купляюць жыхары гарадоў і перабудоўваюць іх на свае патрэбы.

***— Апошнім часам пусцеюць нашы вёскі, а дзеткі, якія яшчэ ў іх жывуць, пачынаюць гаварыць толькі на польскай мове. Ці такое адбываецца таксама ў Трывежы?***

— Я вельмі хвалююся, калі чую, што вясковыя дзеткі гавораць толькі па-польску. Мяне таксама намаўлялі, каб я сваіх дзяцей вучыў размаўляць з малога па-польску. Аднак я паўтараў, што наша мова прыгожая і нельга яе забываць. Зараз многія бацькі не патрабуюць ад сваіх дзетак, каб гаварылі па-свойму і яны вучацца размаўляць на польскай мове. У Трывежы некаторыя дзеткі гавораць з бацькамі па-свойму, а некаторыя ўжо на польскай мове. Я гавару вяскоўцам: гаварыце з дзеткамі па-свойму і яны навучацца роднай мовы.

***— Вы дзве кадэнцыі былі радным Гайнаўскай гміны, выбраным жыхарамі Трывежы і Чыжык...***

— Каб нешта зрабілі ў наваколлі вёскі, трэба „выхадзіць” гэтую справу. Апошнім часам асфальтавалі панятовую дарогу з Трывежы ў Ласінку. Пачалі асфальтаваць дарогу з Чыжык у Новае Беразова. Былі планы асфальтаваць дарогу з Трывежы ў Катоўку, але работы ў гэтым напрамку спыніліся. Не рашыўся я быць кандыдатам на раднага апошнім разам, аддаючы месца працы малодшым. Солтысам з’яўляюся я з 1984 года.

***— У Вас на панадворку стаіць трактар. Ці надалей гаспадарыце?***

— Поле я перапісаў на дзяцей. Покі быў яшчэ нейкі прыбытак, гаспадарылі. Цяпер рукі апускаюцца, калі чую цэны на збожжа і сродкі раслінная вытворчасці.

***— Аднак Ваш дом шыкарна адрамантаваны. Хіба нехта з дзяцей хоча астацца жыць у Трывежы?***

— Дом я збудаваў у 1964 годзе. Хаця дзеці зараз жывуць у Беластоку і Познані, то пасля хочуць вяртацца жыць у родную вёску. Капітальны рамонт праводзіў я з дапамогай дзяцей і закончыў толькі ў мінулым годзе.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Аляксей Мароз**

# Турызм на Гайнаўшчыне

**Гайнаўская гміна можа ганарыцца найбольшай колькасцю запаведнікаў у маштабе Падляшскага ваяводства, а мо і краіны. Найбольшыя атракцыі гміны звязаны з Белавежскай пушчай, аднак гэтыя вартасці, асабліва прыродныя і архіталагічныя каштоўнасці даліны рэчкі Лясной, недастаткова выкарыстоўваюцца ў турыстычных мэтах. Таксама і культурныя каштоўнасці выносяцца недастаткова. Добра развіты агратурызм, а частка кватэр у аўтэнтычных драўляных дамах прапануе мясцовыя стравы, праезды брычкай і г.д.**



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*У „Ранча Купала” наймалодшыя маюць за чым панаглядаць*

Вялікую частку Гайнаўскай гміны займае Белавежская пушча са шматлікімі ўрочышчамі, запаведнікамі і ландшафтнымі ды прыроднымі каштоўнасцямі даліны ракі Лясной. Заходняя частка гміны плоская і бязлесая, ландшафтна нецікавая.

Участак Белавежскай пушчы, які ахоплівае Гайнаўская гміна, поўнасцю знаходзіцца ў межах абшару ахоўваемага краявіду. На тэрыторыі гміны ёсць звыш дзесятка запаведнікаў прыроды: Ліпіны, Шчакатова, Дубовы Груд, Перавалока, Беразова, Сіткі, Альшанка-Мысліўшча, Міхнаўка, Незнанова, Глыбокі Кут, фрагменты запаведнікаў Старына, ландшафтнага імя Уладыслава Шафера ды запаведніка Падляшскага таварыства аховы птушак Васількова. Да таго ж на тэрыторыі гміны ёсць некалькі дзесяткаў помнікаў прыроды, у іх ліку буйныя дубы.

Да найважнейшых помнікаў у гміне належаць культавыя аб'екты: гістарычныя драўляныя цэрквы ў Новым Беразове (дзве: з 1771 і 1840 гг.), Арэшкаве (1940), урочышчы Крыначка каля Гайнаўкі (дзве: 1846 і 1848 гг.), мураваныя ў Новым Беразове (1876) і Дубінах (дзве: 1867 і 1898 гг.), шматлікія каплічкі, могілкі ў Новым Беразове, магіла паўстанцаў 1863 года каля Арэшкава ды запаведныя прастаравыя планіроўкі вёсак з іх драўлянай забудовай — асабліва ў Новым Беразове, Навасадах, Трывежы, Чыжыках і Арэшкаве. У Новым Беразове ёсць скансэн Хата Стэфана, у Арэшкаве дзейнічае фальклорны калектыў „Арэшкі”, у Лазіцах займаюцца пячэннем хлеба і вышыўкай. У Арэшкаве-Парыеве дзейнічае агратурыстычнае гаспадарства „Ранча Купала” Ірэны і Зіновія Галёнкаў, якое карыстаецца асаблівай папулярнасцю сярод моладзі і дзяцей.

Праз Гайнаўскую гміну пралягае чатыры пешыя турмаршруты:

— зялёны Гайнаўка — Белавежа (паралельны да шашы паміж гэтымі мясцовасцямі;

— Шлях партызанскага змагання (чырвоны) з Гайнаўкі ў Нараўку на адрэзку Гайнаўка — запаведнік Ліпіны — запаведнік Шчакатова;

— шлях Па слядах студзеньскага паўстання (сіні) Гайнаўка — Арэшкава — Гайнаўка;

— жоўты з Тапіла ў Белавежу на адрэзку Тапіла — запаведнік Міхнаўка — запаведнік Альшанка-Мысліўшча — запаведнік Беразова.

Размечаны і чатыры веламаршруты:

— Шляхам праваслаўных храмаў (жоўты) на адрэзку Чыжы — Новае Беразова — Гайнаўка — Дубіны — Васількова — Ласінка;

— сіні Гайнаўка — Арэшкава — Гайнаўка;

— жоўты Дубічы-Царкоўныя — Тапіла — Белавежа;

— чырвоны на адрэзку Гайнаўка — Дубічы-Царкоўныя.

У Надлясніцтве Гайнаўка размечаны прыродны шлях Лясныя асаблівасці каля Тапіла, вузкакалейкай можна праехацца ў Тапіла і Ліпіны. У брычках, вазах і санях можна паездзіць у Пасталове і Пасечніках-Вяліківіх, пагуляць у брычцы і ў застоллі — у Парыеве і Тапіле.

Начлежная база канцэнтруецца ў паляўнічай кватэры ў Тапіле (12 месц) і ў чатырнаццаці агратурыстычных кватэрах (разам сто месц) у Савіным Грудзе, Пасталове, Новым Беразове, Чарлёнцы, Арэшкаве, Лазіцах, Навасалах, Парыеве, Ліпінах. Гастраномія — у заезным двары „Мыслі́ўскі” па шашы Гайнаўка — Белавежа і ў карчомцы „Апошні грош” у Тапіле, якая прапануе мясцовыя кулінарныя вырабы.

**Міхал Мінцэвіч**

# Веласіпедныя вандроўкі

Наогул рэчаіснасць уносіць карэктывы ў спадзяванні. Так было і гэтым разам. На другі дзень пайшоў дождж, хоць раніца не прадказвала змены надвор'я. Каля шостай гадзіны нават свяціла сонца.

Што ж рабіць? Трэба будзе яшчэ раз перачытваць даступную прэсу, бо веласіпедныя вандроўкі па сцежках кляшчэлеўскага наваколля пакуль што не адбудуцца. Куды ж я не планаваў ехаць: у Чаромху, Полаўцы, слаўны — дзякуючы Васілю Петручуку — Грабавец, Вілюкі, Войнаўку, Тапіла і іншыя. Ну і, вядома, у Белавежскую пушчу, найлепшы натуральны інгалятар для пенсіянера.

Добра, што гаспадары Кляшчэлеўскай зямлі размецілі веласіпедныя сцежкі, тады блудзіць не буду. Меўшы да таго карту, можна запланаваць вандроўкі на кожны дзень пабыўкі сярод зялёных палёў і лясоў гэтага пакуль што ціхага кутка Беласточчыны.

Дабрывада, дзе я затрымаўся ў агратурыстычнай кватэры спадарства Зіневічаў, раскінулася над рэчкай Дабрывадкай (Dobrowódka), адкуль пэўна і ўзяла сваю назву вёска. Але замест добрай „wódki” выцякае з крыніцы крынічная вада, бо калі б была яна такая, як у назве, то мясцовасць была б найбольш папулярнай турыстычнай мясцовасцю не толькі на Беласточчыне.

Прыгадаў я, што гаспадары Кляшчэлеўскай зямлі размецілі веласіпедныя сцежкі. Гэта праўда, але дакладней адну, так званы „чырвоны шлях” даўжынёй 85 км. Бярэ яна пачатак у Гайнаўцы і вядзе праз Новае Беразова, Чыжы, Збуч, Мора, Дубічы-Царкоўныя, Кляшчэлі, Чаромху і канчаецца ў Пясках. У мінулым годзе аб'ехаў я частку чырвонага шляху, які пралягае праз Гайнаўскую, Чыжоўскую і Дубіцкую гміны. У гэтым годзе размецяць другую частку, якая праходзіць праз Кляшчэляўскую і Чаромхаўскую гміны, і намнога турысту прыгажэйшую, бо вядзе большай часткай праз Белавежскую пушчу.

Раён Гайнаўскага павета, можна сказаць, прымеркаваны для турыстаў. Прынамсі ў форме агратурыстычных кватэр, згуртаваных у Белавежскім агратурыстычным таварыстве „Зубр”. Таварыства „Зубр” аб'ядноўвае 38 кватэр у пушчанскіх і прыпушчанскіх вёсках Белавежскай пушчы: ад Лукі, праз Нараўку, Белавежу, Дубічы-Царкоўныя і дзве кватэры на поўдні пушчы — у Дабрывадзе і Сухавольцах. БАТ „Зубр” выдала інфармацыйны даведнік дафінансаваны праектам DANCEE „Puszcza Białowieska”, рэалізаваным Дацкім агенцтвам аховы асяроддзя (DANCEE).

Можна сказаць, што даведнік выдадзены прафесійна, а зацікаўлены турыст знойдзе ў ім дэталёвую інфармацыю пра кожную з агратурыстычных кватэр, ілюстраваную нават каляровымі здымкамі. Акрамя таго пра турыстычную Гайнаўшчыну можна даведацца на інтэрнэт-старонках: www.bialowieza.org.pl і www.powiat.hajnowka.pl, ды таксама на іншых вэб-старонках.

Заахвочваю наведаць гэтыя закуткі Беласточчыны.

**Міхась Куптэль**

# Магія зёлак

На свята Іаана Хрысціцеля і, наступнага дня, у Пяценку, наведаў я Святую Гару Грабарку. Пасля літургіі многія старэйшыя жанчыны выходзілі з царквы з пасвенчанымі букетамі зёлак. Пра тыя зёлкі я завёў кароткую гутарку з дзвюма жыхаркамі Сычоў, спадарынямі Надзяй і Валяй:

— Усе гэтыя зёлкі вельмі карысныя дома. Лісце клёну мае моц засцерагання ад праклёнаў. Баркун трэба павесіць у сенях, каб дрэнныя людзі не мелі доступу ў хату. І яшчэ адно яго прымяненне: знеахвочвае п'яніц да гарэлкі. Калі ў вашай вёсцы якая жанчына мае мужа-п'яніцу, тады ёй скажыце, што трэба высушаныя крышынкі баркуну насыпаць яму ў вопратку, якую апранае штодзень. А пасля, перад мыццём, тыя церушынкі вытрасці на газету і зноў насыпаць іх у чыстую вопратку. Гэта трэба паўтарыць тры разы — ахвота да гарэлкі адыдзе яму назаўсёды! З іншых зёлак карысны крываўнік, які прымяняюць у час крывацёку. Перастрашнік ад перапуду — ім трэба дзяцей абкурваць: калі часам малое дзіця зрываецца спрасонку, яго абдаецца дымам і дзіця ўспакойваецца. Ну, і святаяннік ад печані...

— Адкуль вы так добра ведаеце пра зёлкі? — пытаю сваіх цудоўных суразмоўніц.

— Пра гэтыя зёлкі я ведаю ад маёй мамы, — кажа спадарыня Надзя.

— А „Ніву” чытаеце?

— У вёсцы ёсць такія, што чытаюць.

А звязка баркуну, якую я атрымаў ад пані Валі і павесіў у сенях сваёй хаты, мабыць засцеражэ мяне ад візітаў ліхіх людзей. **(мц)**

# Выбары

Хутка пойдзем выбіраць новых парламентарыяў у новы Сейм і Сенат. Толькі ці ён будзе новы? Новы ў старым выданні.

Слухаючы ў тэлебачанні праграму „Prosto w oczy” відаць, як нашы будучыя пасло будуць пра нас дбаць. Права і Справядлівасць крычыць: „Досыць камуны!” Шаноўныя браты лідэры ПіСу абяцаюць рай на зямлі. Ракіта хоча забраць еўрасаюзныя грошы ад гаспадароў. Ліга польскіх сем'яў супраць Еўрапейскага Саюза. Лепэр хоча і Грамадзянская платформа — змяніць Канстытуцыю. Нядаўна „Кур'ер паранны” запытаў, ці няма ў Польшчы Пінача? Няўжо ў Польшчы няма чалавека, каб навесці парадак? Ёсць людзі разумныя, толькі ёсць лозунг — „Галаву ты маеш, быў бы дэпутатам, але вось правоў не маеш — адыдзі назад”.

За камуны — якую так не любяць — мой дзядзька быў кандыдатам у паслы. Ён быў не вучоны, не прафесар, а звычайны хлоп — як яны кажуць.

У Міхалове на пошце ёсць кіраўнічка, спадарыня Дарота Садоўская. Яна кожнага паслухае, і ў меру сваіх абавязкаў паможа кліенту. Такіх людзей ёсць многа ў Польшчы, чаму ж іх не выбіраць?

**Дзядзька Захар**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# Дзедкавым шляхам

Эліза Наумюк (на здымку ніжэй) з Беластока мела свой ларок разам з татам на фэсце „Гродна-Беласток”, на якім выступала шмат выканаўцаў песень ды мастакоў. Тата Элізы — Міраслаў — вядомы малады разбяр, слаўны не толькі на Беласточчыне сваімі вырабамі, найбольш драўлянымі фігуркамі птушак. Кожную птушку можна распазнаць — дзе верабей, дзе ўдод, дзе сокал... Тата працуе ў Падляшскім музеі, што ў ратушы ў Беластоку. А дзедка маладой мастачкі — славуты разбяр з Канюкоў Уладзімір Наумюк. Дзедка рэжа ў драўніне шмат гадоў, і постаці ў яго выходзяць людзей — аратых, гаспадынь, святых... Эліза паказвала гледачам сваіх анёлкаў. Анёлка ніхто папраўдзе не бачыў — але, вось, Элізіны рэзьбы як сапраўдныя: анёлкі ў парах і паасобку, з крыламі, у шатах, даўгавалосыя, вельмі мілыя і святыя. Гэтак іх уяўляе дзяўчынка, якая восенню пойдзе ў першы клас гімназіі, што па вуліцы Лясной у Беластоку.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Тата Элізы Наумюк — Міраслаў — вядомы малады разбяр, слаўны не толькі на Беласточчыне сваімі вырабамі, найбольш драўлянымі фігуркамі птушак, а дзедка маладой мастачкі — славуты разбяр з Канюкоў Уладзімір Наумюк...

— Я хаджу ў Гарадскі дом культуры, да пані Лідзіі Добаш на заняткі, вучуся рабіць біжутэрыю, строікі і іншыя мастацкія вырабы. Рэзьбіць у драўніне для мяне яшчэ зацяжка. Можа і пайду следам майго дзядулі. Езджу да яго штотыдзень, узіраюся. Мой дзедка — вялікі майстар! **(лук)**

# Школьнікі на „Басовішчы”



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Вучні Пачатковай школы № 4 і Гімназіі № 7 у Беластоку на Фестывалі „Басовішча 2005” у Гарадку*

Беластоцкія навучэнцы беларускай мовы ўсе ведаюць адзін аднаго. Іхняе сяброўства мацуецца яшчэ з часу, калі арганізаваўся ў Беластоку беларускі дзіцячы садок. Цяпер жа тыя „першыя” выпускнікі вучацца хто дзе — у Пачатковай школе № 4, у Гімназіі № 7... Да кампаніі далучылася Іаанна Стэльмашук, якая з усіх іх найстарэйшая ды вучыцца ў беластоцкім ліцэі.

Школьная моладзь разам ездзіць на экскурсіі ў Беларусь, на беларускія летнікі ў час канікул... Хлопцы і дзяўчаты дамаўляюцца на сустрэчы з сабою на Інтэрнэт-чатах, перадаюць сабе вітанні і здымкі. Разам паехалі і на сёлетні Фестываль „Басовішча”. Віталіся яны там дэманстратыўна і напаказ усім іншым удзельнікам Фестывалю. Глядзіце, якая з нас група, як мы трымаемся разам...

Жадаю Вам гэтак прайсці і рэшту жыцця. Нагадаю, што спадар Пякарскі і аўтар гэтых радкоў зрабілі Вам гэтага лета падарунак у выглядзе Цэнтральнага Архіва Вашых Здымкаў: **http://212.33.75.178/** (ам)

# Успамін канікул

*Гмінны асяродак культуры (ГАК) у Дубічах-Царкоўных (Гайнаўскі павет) аб'яўляе фатаграфічны конкурс пад загалоўкам „Успаміны з канікул”. Фотаздымкі можна высылаць або прыносіць да 27 жніўня г.г. у бібліятэку дубіцкага ГАК.*

*Вынікі конкурсу будуць падведзены 31 жніўня і ў той жа дзень будзе адкрыта пасляконкурсная выстаўка найлепшых прац. Пераможцы атрымаюць узнагароды-неспадзяванкі.* **(мох)**

*Станіслаў ШУШКЕВІЧ*

## Перапёлачка

*Любіць перапёлачка жартаваць, —*
*Жыта недаспелае кліча жаць:*
*— Ідзі жаць! Пара жаць!*
*Не паспеюць жніва распачаць,*
*А яна пабегла ў сенажаць:*
*— Ідзі спаць! Пара спаць!*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Зорку” вітаюць з „Басовішча” Вераніка (Мінск) ды ліцэістка Іаанна (Беласток)

# Дамашнія куніцы

Нядаўна, калі мы з жонкай вярнуліся ад кароў, яна пайшла на другі панадворак выпусціць курэй. Хутка яна вярнулася і кажа:

— Ідзі глянь, што ў куратніку; гэта работа тваіх „сяброўак” (так я заву каменак, дамашніх куніц, што развяліся ў нас).

І сапраўды, калі я ўбачыў, што там нарабілася, дык не ведаў што сказаць: усе маладыя куры (або інакш — вялікія кураняты) былі падушаны і некаторыя асталіся нават без галоў. На зямлі ляжала іх семнаццаць штук.

— Мо гэта тхор? — гавару.

— Ты і тхара шкадуеш! — папракнула мяне жонка.

Сапраўды, бацька калісь гаварыў, што дзе тхор завёўся, там мышэй няма. Што ж, сталася — са сваёй падачы, як гаворыцца. Дзверы ў куратнік не былі шчыльна закрыты, бо ўгары асталася шчыліна, праз якую тхор і пралез. Яе хапіла закрыць, залажыўшы клінок пад засаўку, што заўсёды і рабілася. Так, гэта зрабіла каменка, бо тхор праз такую малую шчыліну не пралез бы і, гавораць, ён бы ўсіх курэй не падушыў, мо толькі 2-3 штукі загрыз бы. Праўду кажуць: век вучысь...

У мінулым годзе здарылася ў мяне падобная гісторыя: нанач я забыў зачыніць дзверы ў куратнік і каменка ўсіх (дванаццаць штук), немалых ужо, куранят падушыла. Жонка лічыць, што я і ваўка шкадую і мо таму ён мне „аддзячыў”, бо нядаўна на пашы ў Жарыўцы, дзе навокал кусты і лес, загрыз нам цяля (гэта паказала беластоцкае тэлебачанне).




Так, я шаную і шкадую тых звяроў, звяркоў, грызуноў, насякомых, што пад аховай, а пад аховай менавіта і каменка, і воўк. Мне здаецца, што гэтай аховы не прыдумалі дурныя людзі і не яны напісалі пра гэта ў даведніках. Можна падумаць, што я і пацука шкадую, але гэта няпраўда, бо пацукі з’яўляюцца шкоднымі грызунамі. У нас водзяцца чорныя і шэрыя пацукі, а ёсць яшчэ і вадзяны пацук, да якога я калісь меў нейкі сантымент, але і ён шкоднік, хаця на від ён не такі агідны як тыя першыя, бо ў яго хвост не голы, толькі пакрыты шэрсцю. У вадзе водзіцца яшчэ і андатра, якой шкурка цэніцца таксама як і шкурка вадзянога пацука. Ёсць у нас і мышы, якіх можна падзяліць на шкодных і менш шкодных. Найгоршыя з іх хатнія мышы, якія водзяцца і ў хаце, і ў іншых будынках. Ёсць і палявая мыш, якая жыве і наносіць шкоды ў полі, таму я стаўлюся да яе абыякава. Ёсць мыш, якая водзіцца на лузе, якая нам шкоды не прычыняе. А ёсць і буразубка, вельмі падобная на мыш, толькі лычык у яе даўжэйшы і вастрэйшы, але яна карысная, бо з’ядае толькі чарвякоў і вусеняў; калі кот яе ўпалюе, задушыць, але не з’есць.

А каменкі развяліся ў нас як ніколі, у тым ліку на маіх двух панадворках. Удзень іх не ўбачыць, бо схаваныя ў сваіх гнёздах, але ўначы чуваць іх піскі і можна ўбачыць, як перабягаюць вуліцу ці спрытна бегаюць па плоце або нават сцяне. Некалькі гадоў таму ўлетку спаў я ў старой хаце, калі пачуў піск каменак, якія прыбеглі з другога панадворка і бегалі вакол хаты, гатовы ўварвацца ўсярэдзіну, так што прыйшлося закрыць вокны, якія былі прыадкрытыя.

Кажуць, што гэтыя звяркі ўмеюць дабірацца па сцяне да гнёздаў ластавак, а нават да буслінага гнязда, як у Чахах-Арлянскіх, дзе адзін дабрадушны мужчына палкай прагнаў іх.

Каб каменкі, тхары ці іншыя драпежнікі не чынілі нам шкоды, трэба дзверы нашых куратнікаў шчыльна зачыняць нанач.

**Мікалай Панфілюк**

## Вершы Віктара Шведа

### *Перапіска*

*На сцэнах з раскошай*
*Пішуць без патрэб:*
*„Я не маю грошай*
*На звычайны хлеб”.*

*Нехта знерваваны*
*Дапісаць паспеў:*
*„А на шпрэй, каханы,*
*Грошыкі ты меў?”*

### *Каштанавае дрэва*

*Запытаў Сяржу*
*Дапытлівы калега:*
*— Па чым пазнаць мы можам*
*Каштанавае дрэва?*

*— Вядома, па каштанах.*
*— А калі іх не мае?*
*Адказ быў нечаканы:*
*— Тады я пачакаю.*

**Мікалай Лук’янюк**

### *Муха*

*„Ой ты, муха, не лятай,*
*Бо буду ганяць!*
*Пацну лапкай па табе —*
*Не будзеш кусаць!”*

*Муха бзыкнула ў адказ:*
*„Не палохай муху!*
*Сяду і цябе ўкушу*
*Проста ў нос ці вуха!”*

### *Зайка*

*Зайчык шэры, касавокі*
*Раз замарыў быць высокім,*
*Стаў на лапках разглядацца,*
*Каб з кумой сваёй спаткацца.*

*А зайчыха засмяялася*
*Зайцу шэраму ў адказ:*
*„У мураўцы я схавалася!*
*Нахіліся ты хоць раз!”*

## Польска-беларуская крыжаванка № 32

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку № 28:** Павук, яд, Об, грыб, сход, ява, таполя, хмара, маладзік, сена, асілак, роля, альха, Ева, клён, рачулка, Іна, Ян, ер, свет, сава, вуха, сілач, хмель, код, манах, талака, мара, падарак, яр, Лі, ды, ён, бляск, ясна.

Узнагароды, беларускія кніжкі, выйгралі: **Тамаш** і **Уршуля Міхалюкі** з Чыжоў. Віншуем!



# Вяртанне да каранёў

**У III Белавежскіх інтэграцыйных мастацкіх сустрэчах „Ператоча 2005” прынялі ўдзел прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Усе яны спаткаліся з гасціннасцю мясцовай публікі і арганізатара мерапрыемства — Цэнтрам прапагандавання рэгіёна Фонду „Царкоўная музыка”. У пачатку сустрэчы выступілі беларускія калектывы з прыпушчанскай тэрыторыі, якую ў палове мінулага стагоддзя раздзяліла мяжа.**



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Калектыў „Катрынка” з Высокага

У Белавежы мелі нагоду спаткацца жыхары з-за абодвух бакоў граніцы, якія прэзентавалі фальклорныя песні сабраныя ў наваколлі Белавежскай пушчы. Публіка магла пазнаёміцца таксама з культурай іншых нацыянальнасцей. Ажно з Растова, распаложанага ў Расіі, прыехалі данскія казакі — прафесійныя спевакі і танцоры. Выступілі палякі, літоўцы, немцы, яўрэі, лэмкі і беларускія калектывы з больш аддаленых ад нас мясцовасцей. Арганізатар мерапрыемства Мікола Бушко патлумачыў, што „ператоча” і „ток” былі ў „клуні” месцамі культурных падзей, адкрытымі на гасцей. Публіка з Гайнаўшчыны і турысты цёпла прынялі ўсіх спевакоў і танцораў, што расслаўлялі белавежскае „Ператоча”.

Сустрэчу афіцыйна адкрыла белавежская войт Анна Байко, заклікаючы захоўваць даўнія традыцыі. Мерапрыемства распачалося з вельмі ўдалага выступлення калектыву „Жэмэрва”, што ўзнік пры Музеі малой айчыны ў Студзіводах. Дзяўчаты запрэзентавалі аўтэнтычныя песні запісаныя ў вёсках Бельшчыны і Гайнаўшчыны, якія моцна ўзрушылі публіку. Выкананне даўніх песень гімназісткамі і ліцэісткамі ўнесла подых маладосці і рэфлексіі наконт жыцця на Гайнаўшчыне ў мінулым.

— Мы спяваем калядкі, агулькі, жніўныя, хрысцінныя і іншыя песні, — кіраўнік калектыву Анна Фіёнік стала пералічваць сабраныя па вёсках песні. — Мала людзей ужо памятае старыя песні. Каб іх сабраць, трэба знайсці старэйшых спевакоў. Па некалькі разоў прыязджаем да іх, каб маглі ўспомніць усе словы.

Мікола Бушко заявіў, што сёлетняе белавежскае мерапрыемства адбываецца з асаблівым ухілам на аўтэнтычны неапрацаваны фальклор. Пацвярджэннем яго слоў было таксама выступленне калектыву „Кудмень” з Мінска, які прэзентаваў песні Палесся.

— Мы прыходзілі да прэзентавання неапрацаванага беларускага фальклору рознымі дарогамі. Некаторыя члены нашага калектыву праходзілі праз рок-музыку. У нашым рэпертуары з самага пачатку толькі народны фальклор, сабраны на Палессі, — сказаў Андрэй Філіпаў з „Кудменя”, які разам з сябрамі побач спеву рашыўся вучыць сабраных народным танцам.

Выступленні калектываў „Жэмэрва” і „Кудмень” адбыліся дзякуючы супрацоўніцтву Міколы Бушко з Дарафеем Фіёнікам і Музеем малой айчыны ў Студзіводах. Суарганізатарамі мерапрыемства былі Белавежскі асяродак культуры і Белавежскі нацыянальны парк.

— Калі б не Мікола Бушко, то знайшліся б польскія арганізатары белавежскага мерапрыемства, якое ў сярэдзіне лета замацоўваецца ў свядомасці мясцовага насельніцтва, турыстаў і прэзентуе культуры розных нацыянальнасцей, — заявіў Дарафей Фіёнік.

Чарговым выканаўцам, які прэзентаваў фальклорныя песні сабраныя ў наваколлі Белавежскай пушчы, быў калектыў „Катрынка” з Высокага. Маладыя дзяўчаты таксама ездзілі па беларускіх вёсках і запісвалі старыя песні, якія пасля музычнай апрацоўкі ўвялі ў свой рэпертуар.

— Вельмі цікава збіраць фальклорныя песні і займацца працай, якой раней амаль ніхто ў нас не рабіў. Ёсць нагода вяртацца да нашых каранёў, — сказала Даша Сідарук з Высокага, якая многа гадоў займаецца ўжо ў музычным калектыве. — Калі б была магчымасць, мы хацелі б збіраць фальклорныя песні таксама на вашым баку мяжы.

Дзяўчаты запісвалі песні ў Бобінцы і бачылі хаты распаложаныя ў Польшчы, якія да ўстанаўлення дзяржаўнай мяжы належалі да вёскі Бобінка. Хацелі б яны, каб мяжа не была перашкодай у іх працы.

— Цікавяць нас свае песні і хочам захаваць ад забыцця сваю культуру, — заявілі іншыя члены музычнага калектыву з Высокага. На Брэстчыне яшчэ многа асоб ведае даўнія песні і традыцыі. Можа мода на вяртанне да сваіх каранёў прыйшла ў Высокае з Гайнаўшчыны, якая супрацоўнічае з прыгранічнымі раёнамі Рэспублікі Беларусь. Дзяўчаты прыехалі ў Белавежу з апрацаванымі фальклорнымі песнямі, вядомымі таксама і ў нас. Публіка ўспрымала іх з задумай і рэфлексіяй.

— Мы арганізавалі ў Высокім малы музейчык. Сабралі там стары посуд, даўнія прылады працы і вышыўку. Хочам вучыцца народнай вышыўцы, — заявіла Людміла Дудар, дырэктар Цэнтра пазашкольнай работы, пры якім дзейнічае калектыў „Катрынка”.

**Аляксей Мароз**

# *Развіталіся і толькі*

**Успаміны Уладзіміра СКОМІНА, народжанага ў 1923 годзе ў Грабянях.**



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У школу хадзіў я ў Бутрымаўцы, што былі адзін кіламетр ад Грабянёў. Вучыўся ўсяго тры гады, бо правялі ў нас камасацыю і нам далі зямлю ў Каленіі Грабяні, што каля Новага Двара. І адтуль не было як у школу хадзіць. Сям'я наша вялікая была, а гаспадарка ў нас — малая і трэба было на зіму зарабляць. Служыў я тры гады ў аднаго гаспадара ў Бялянах, што цяпер за граніцай, кароў з вясны пасвіў. А як падрос, то стаў хадзіць на работу ў маёнтак Вінаградава ў Караліне. Там, акрамя парабкаў, што ў маёнтку жылі, працавала яшчэ нас тры дзяўчыны і чатырох хлопцаў. Рабілі гаспадарчую работу: касілі, малацілі, аралі.

У 1939 годзе я стаў працаваць на дарозе з Сухаволі ў Гродна, на адрэзку каля Новага Двара. Там мы дзіры латалі ў дарожным палатне, падсыпалі, жвіравалі. Працаваў аж да прыходу немцаў. Немцы застрэлілі дарожнага майстра, а мы паўцякалі.

7 красавіка 1942 года солтыс вызначыў маю сям'ю на работу ў Германію. У той час я ўжо жанаты быў і ў нас было двухмесячнае дзіця. Раней забралі майго брата, а цяпер маю сям'ю, бо лічылі, што нас многа. Спярша загналі нас у Новы Двор, а пасля на станцыю Бяляне. Адтуль у гродзенскую турму. Патрымалі нас двое сутак, пагрузілі ў вагоны і павезлі ва Усходнюю Прусію. Завезлі ў павятовае мястэчка Эбенродэ, дванаццаць кіламетраў ад літоўскай граніцы.

У гаспадара атрымаў я чатыры кані да работы. Нашай сям'і далі адзін пакой. Гаспадар плаціў мне 24 маркі ў месяц — адно толькі каб харчы купіць. І карткі на ежу давалі. Куплялі ў краме, якая была ў Эбенродэ, два кіламетры ад нашага маёнтка. Дзіця забіралі з сабою ў поле, бо работу трэба было рабіць.

У нашай мясцовасці былі англічане, бельгійцы, французы, італьянцы. Яны штомесяц атрымоўвалі з Чырвонага Крыжа пасылкі; частавалі нас то шакаладкамі, то папяросамі. Былі чатыры польскія сям'і, двух літоўцаў. Былі палякі Вісьнеўскі і Юрчак, і Рузя з-пад Ломжы, і дзяўчына з Канюшкаў, і з Бернікаў. Збіраліся мы ў нядзелю.

Наш гаспадар трымаў сорак штук коней, меў два трактары — не абыякі гаспадар быў! Разводзіў ён коней, і як добры конь быў, то бралі яго ў армію, а калі абы-які, таго бралі на гаспадарку. Нас, конюхаў, было чатырох, у кожнага па чатыры кані было. Гаспадар сядлаў каня, і сын, і дзве дачкі таксама на конях ездзілі, наглядалі. Або ў брычку запрагалі і ехалі.

Гаспадары адносіліся да нас нядрэнна. Былі і такія немцы, што патаемна прыносілі ежу нашаму малому, бо такая дапамога была забаронена. Так было да прыходу саветаў.

Мяне адразу, 15 сакавіка 1945 года, забралі ў армію, бо малады быў. А жонка асталася і яе дапытвалі, мо з паўгода ў лагеры трымалі. Не было нам куды хавацца, бо невядома было, як далей быць; развіталіся мы ды і толькі.

Абучалі нас два тыдні: маеш аўтамат, а рэшту і сам навучышся. І кінулі на фронт, туды, дзе не хапала войска. Завезлі нас у Волін, закрыць немцаў у кацёл. Мяне там раніла асколкамі ў ногі і грудзі. Спярша ляжаў я тры месяцы ў палявым шпіталі, а пасля перанеслі ў шпіталь, які стварылі ў былых нямецкіх казармах. Са шпіталя забралі мяне ў запасны полк і зноў на службу.

Прыехаў сяржант, набраў колькі яму трэба было людзей і павёз нас у Свідніцу; там стаяў штаб 4 авіярміі. Пры штабе я працаваў паштавіком.

З арміі звольнілі мяне 12 лютага 1948 года. Ведалі, што мая мясцовасць у межах Польшчы, таму там і выпусцілі. Прыехаў я поездам у Саколку, а з Саколкі ў Новы Двор пяшком прыйшоў. Мая сям'я была ўжо дома, вярнуліся восенню 1945 года перад Усімі Святымі.

У 1948 годзе праставалі польскасавецкую мяжу, мянялі. І Хварасцяны, дзе жыў мамін брат, перайшлі пад Польшчу. Саветы ўсіх праваслаўных з Хварасцян — хочаш не хочаш — забралі на свой бок, у тым ліку і дзядзьку. У вёсцы было сем праваслаўных сем'яў і ўсіх забралі, нікога не пакінулі! Раней і па навакольных вёсках хадзілі, намаўлялі да выезду. Пасля ў Хварасцяны прыехалі дзве каталіцкія сям'і Тамашэўскіх з суседняй вёскі, што асталася на савецкім баку. Іхнюю вёску раскідалі, бо на яе месцы саветы задумалі паставіць пагранзаставу.

Я рашыў узяць дзядзькаву зямлю ў Хварасцянах. Гаспадарку дзяржава выцаніла і я ўзяў яе на выплату, дваццаць гадоў паволі плаціў. Купіў усё — з хатай, стадолай і хлявом. А дабытак трэба было купляць асобна. Гаспадарыў да мінулага года, гаспадарку пакінуў сыну, а сам перасяліўся да дачкі ў Хільмоны-Каленію.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**

*Сёння на „Сяброўскай бяседзе” выступіць каля сарака калектываў з Польшчы, шэсць з Беларусі і адзін з Украіны. Усё пад выбухі феерверкаў, пры пячэнні парасят, на ўквечанай сцэне, са сталом, дзе расселіся нашы прыгажуні-мастачкі...*

# Пабяседавалі ў Гарадку

**— Гарадок гуляе, адным словам, — падагуліў Анатоль Парэмбскі, народны паэт з Валіл-Станцыі тое, што пару крокаў ад яго хаты тыдзень у тыдзень адбываюцца гучныя мерапрыемствы, на якія звальваюцца ва ўрочышча Барык „найменш тры паветы, а можа і паўсвету”. Толькі што скаланулася ціхае месца на паляне ад маладое беларускае музыкі, як гміна, разам з беларускім таварыствам, запрасіла на чарговую „Сяброўскую бяседу”, другое „паўсвету”, не зусім іншае ад тае рэшты, што гуляла на „Басовішчы”.**

Адно машын больш на абочынах паставіцца, бо моладзь дабіралася найчасцей з палаткамі ды на сваіх дваіх. А ад тае імпрэзы яшчэ прагучыць Лявон Вольскі, легенда беларускага рока, што ў гэты раз прывязе „Крамбамбулю” на пацеху і старым, і малым.

Гарачыня, што дыхаць няма чым. Хоць ідзе на вечар (бяседа мае пачацца ў семнаццаць), ад лугоў не ідзе вечаровая свежасць. У пыле сунуцца аўтобусы з выступоўцамі. Іх сёння яшчэ больш чым заўсёды — арганізатары атрымалі падмацоўку з еўрасаюзных фондаў (20 тысяч еўра), дык раскашэліцца можна. Для народных мастакоў гэта нагода годна выступіць. Анатоль Парэмбскі ўчора здобіў сцэну снапамі жыта, што свежа ўкасіў на сваім палетку, і перад тым, як управіцца разам з жонкай Марыяй, успамінае колішніх народных майстроў-музыкаў, якія пры сённяшніх магчымасцях паказацца знакаміта прагучалі б на тутэйшай сцэне: Габца з Дублян, што і скрыпкі



*О, так трэба рабіць імпрэзы (на другім плане, за першай партай ад дыпламатычнай вайны адпачываюць пасол РБ Павел Латушка і генконсул РБ у Беластоку Леанід Каравайка)*

рабіў з яловага дрэва і пайграць любіў, і іншага музыку, родам з Ганчароў. Гэта як і з пісаннем вершаў ім самім: „Можа ты і не ўрадзіўся на тое, каб стаць паэтам, але каб штось па сабе пакінуць”. І тыя ўсе цёткі (найчасцей), што сёння прыедуць, паспяваць, адарваўшыся ад работы, для таго і цешацца песняй, і вырабам частунку, якім угосцяць сабраных, што і гэта іхны ўклад у падтрымку традыцыі і ўмацаванне свайго месца ў сябе.

Марыя Парэмбская, якую абселі ад пару дзён сваякі, пакуль мусіць з мужам ехаць на лугі падаць кароў. Так заўсёды: „Бярэм плахты, займаем месца, а сама бягу ўправіцца. З’ямо, паглядзім, паслухаем, як нашы «Прымакі» рэкламуюцца...” Пакуль мухі не дапякуць. Панаехала гасцей, найбольш радні, у ваколіцу. Міраслаў Парэмбскі аж з Хэлма прыехаў з радзінай, там ён на кіраўнічай пасадзе, інфарматык, а жонка ягоная псіхолаг, пры судзе працуе. З дзяцьмі прыехалі. Заўсёды хваліць сваё роднае месца — сёння набярэ з сабою рэклам аб Гарадоччыне, бо на рэкламу і месца, і людзей нельга шкадаваць грошай, асабліва тады, калі наведваюць гміну такія „шышкі” — улады, дыпламаты, відныя людзі... Вось і сёння непадалёк ад сцэны стаіць не першы раз ларок, дзе ўсё пра тутэйшыя справы — і буклеты, і даведнікі пра агратурызм, і карты, і „Гарадоцкія навіны” — уласная гмінная газета. А партнёрам пры арганізацыі свята з’яўляецца і Бераставіцкі раён Рэспублікі Беларусь. І хоць у паветры аж густа ад гарачых настрояў „халоднай вайны”, як аб’явілі яе польскія і беларускія СМІ, пра гэта маўчок, бо нашто псаваць настрой бесклапотнай гульні і прыязнасці. „Рэалізацыя гэтага культурнага праекта мае спрычыніцца да ўмацавання супрацоўніцтва мастацкіх і творчых асяроддзяў ды лакальных супольнасцей”...



*Анатоль Парэмбскі з унучкай Каралінай*

Сёння на „Сяброўскай бяседзе” выступіць каля сарака калектываў з Польшчы, шэсць з Беларусі і адзін з Украіны. Усё пад выбухі феерверкаў, пры пячэнні парасят, на ўквечанай сцэне, са сталом, дзе расселіся нашы прыгажуні-мастачкі роднай песні, з гасцінцамі ад калектываў ды сталамі, якія ўгнуцца ад багатага пачастунку. Нішто так не яднае людзей як бяседа.

Пачаў спевы „Расспяваны Гарадок”, не зусім камплектна, бо адна са спявачак пакалечылася, другую, прадаўшчыцу, крамар не пусціў на „выстэмпы”. Малайчыны! Па чарзе выходзілі на сцэну „Лучына” з Беластока, „Арэшкі” з Арэшкава, „Чыжавяне”, „Арляне”, „Каліна” з „Калінкай” з Залук, бельскія „Васілёчкі”, „Крыўчанкі”, козліцкая „Рэчанька”, „Збучанкі”, „Тыневічанкі”, „Вульчанкі” з Вулькі-Тэрахоўскай, „Асенні ліст” ды „Хутар” з Гарадка, „Цаглінкі” са Старога Ляўкова, „Нараўчанкі”, „Дубіны”, „Малінкі”, курашаўскія „Незабудкі”, „Сакрэт” з Міхалова, „Крыніца”, „Каласкі” і „Лідэр” з Беластока, калектыў з Дубяжына, „Клекацякі” з Боцек... Рэй вялі „Прымакі” — і „старыя”, і „маладыя”, якіх кіраўнік Юрка Астапчук, дырэктар гарадоцкага ГОКу, як заўсёды ўмела парываў публіку. Вельмі горача прыняліся „Траецкія музыкі” з Барысава, „Чарлі” з Мінска, „Грымата” са Слоніма, „Вяселле” з Ваўкавыска, „Бераставіцкія музыкі”, „Падкарпацкія музыкі” з украінскага Падкарпацця, „Калахары” ды „Джамбібум” з Мінска і, вядома, „Крамбамбуля” з Лявонам Волскім, якая зайграла яшчэ да белай раніцы з „Лідэрам” і іншымі эстраднымі гуртамі да танцаў публіцы, радай добраму надвор’ю і сяброўскім пачуццям.

**Тэкст і фота Міры Лукшы**




## *Дэвіз простых людзей*

*Усе простыя людзі на свеце,*
*Што працай на хлеб зарабляюць,*
*Жыць хочуць у згодзе, братэрстве,*
*Паганых імкненняў не маюць.*

*Не падае манна ім з неба,*
*Не ждуць ад нікога даніны,*
*Сваім толькі цешацца хлебам*
*А працай багацяць айчыну.*

*І твораць культуру народу*
*Прыязнымі жэстамі, мовай,*
*А музыка, танцы і песні*
*То гэтай культуры аснова.*

*І ўмеюць забавіцца шчыра*
*Як тут, на „Сяброўскай бясэдзе”,*
*Сабраўшыся з цэлага міру*
*І Бог знае адкуль яшчэ дзе.*

*Гучыць песня родных адценняў*
*З Сямятыч да Бераставіцы.*
*Беларусы ўсіх пакаленняў*
*Яднаюцца па-над граніцай.*

*На „Бясэдзе” ўсім стане месца,*
*Найменш будзе нацыі тры:*
*Паляк, беларус, украінец —*
*Усе тут калегі, сябры.*

*Такім людзям нігды не сняцца*
*Касова, Беслан ці Ірак,*
*А тых, што спяшаюцца біцца,*
*Класць бомбы — няхай трафіць шляг.*

***Анатоль Парэмбскі***
***Барык, 30.07.2005 г.***



# www.mickiewicz-museum.narod.ru

Лета 2005 года для жыцця польскага асяродка ў Беларусі адзначанае непрыемнымі падзеямі, справакаванымі лукашэнкаўскай уладай. Менавіта апошняя сваім беспардонным умяшальніцтвам у справы Саюза палякаў Беларусі, прывяла да сур'ёзнага дыпламатычнага канфлікту з Польшчай, які хочаш не хочаш, але адаб'ецца ў рэшце рэшт нядобрым чынам і на беларускай меншасці ў Рэчы Паспалітай. На шчасце, не ўсё пад сілу „гаспадарам жыцця" на высокіх дзяржаўных пасадах. Карані культурных сувязей не перасекчы ўварваннем у які заўгодна будынак узброенымі да зубоў міліцыянтамі, адным з прыкладаў чаго ёсць дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку, на сайт якога мы сёння і зазірнём.

Першая старонка гэтага сайта выглядае прывабна — на светла-зялёным фоне ўверсе знаходзяцца выявы партрэтаў вялікага польскага паэта і фотаздымак музея. Пад гэтымі вывамі па-беларуску і па-польску назва сайта. Крыху ніжэй прывітанне да віртуальных наведвальнікаў ад дырэктара музея Мікалая Гайбы: „Наш музей упершыню быў адкрыты ў 1938 годзе. Сучасная экспазіцыя працуе з 25 мая 2001 года. Штогод музей наведвае да 20 тысяч чалавек, з іх 11% — замежныя турысты. Экскурсіі праводзім на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах".

Першая рубрыка — „Паслугі". У ёй аб тым, што і за які кошт праходзіць у доме-музеі. Сярод паслуг не толькі звычайныя, але і тэматычныя экскурсіі, музычна-педагагічныя заняткі, а таксама літаратурна-музычны салон (гасцёўня).

Вельмі падрабязна аб гісторыі музея распавядаецца на аднайменнай старонцы. Адсюль мы можам даведацца пра тое, каму належыў дом у неспакойныя гады канца XIX — пачатку XX стагоддзяў.

Пэўна, каб неяк адарвацца ад выключна „міцкевічаўскай" тэматыкі, аўтары данага сайта стварылі на ім старонку, у якой распавядаюць пра незвычайныя музеі свету. Да іх адносяцца музей бульбы ў Брусэлі, нячысцікаў у Каўнасе, музей кахання на радзіме Дон Кіхота і некаторыя іншыя.

Каб больш даведацца пра асобу дырэктара музея дастаткова „клікнуць" на выйсце да ягонага сайта. Гэтае выйсце месціцца сярод іншых выйсцяў да рубрык „Дома-музея Адама Міцкевіча". На дадзеным сайце падаецца даволі поўная інфармацыя як пра гэтага навагрудскага гісторыка, так і сам старажытны Навагрудак.

Вартымі ўвагі можна назваць старонкі „Навіны" і „Фота". У першай распавядаецца пра важныя для музея падзеі і сустрэчы, а ў другой — многае з таго праілюстравана здымкамі.

Пра біяграфію Адама Міцкевіча вельмі змястоўна распавядаецца ў рубрыцы „А. Міцкевіч", прычым робіцца гэта не толькі на беларускай, але польскай і англійскай мовах.

Старонка, у якой можна пазнаёміцца з выказваннямі вядомых людзей аб вялікім польскім паэце, называецца „Аўтографы". Таму скончыць гэтую віртуальную вандроўку па музеі, зважаючы на дэструктыўную палітыку лукашэнкаўскай улады, варта словамі Уладзіміра Караткевіча: „Мы, беларусы, ганарымся яго імем разам з палякамі, бо гэта нашы рэкі і пушчы закінулі ў душу паэта першыя іскры паэзіі, бо гэта ад туганавіцкага няшчаснага кахання пачалі спяваць струны яго ліры, бо «Свіцязянка» — ад Свіцязі, бо мерны і пагрозны крок гісторыі ў творах яго — ад веж Наваградскіх. І таму ён, Адам — з намі, а мы ўсе — з ім".

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Вікторыя Азаранка ў пары з венгеркай Агнеш Шаваі выйграла парны разрад юніёрскага спаборніцтва на Уімблдонскім турніры. Гэта ўжо другая перамога ўзыходнай зорачкі...*

# Беларусь, беларусы...

**Ліпеньская „малацьба"**

Гарачы ліпень не прынёс беларускім спартоўцам значных медальных поспехаў. Месяц быў напружаны і неадназначны. Зусім няўдала выступілі нашы плыўцы на чэмпіянаце свету, не дацягнулі да п'едэсталу на першынстве Старога свету фехтавальнікі, расчаравалі на турніры ў Маскве баксёры. З іншага боку абнадзеілі на чэмпіянаце краіны і іншых турнірах напярэдадні чэмпіянату свету ў Хельсінкі лёгкаатлеты. Не дзіва, што яны пераважаюць у спісе лепшых. Асабліва ўразіла „малацьба" кідальнікаў.

Насуперак завядзёнцы пачнем з каманды месяца. У Быдгашчы жаночая зборная Беларусі па лёгкаатлетычным шматбор'і заваявала Кубак Еўропы. У складзе пераможнага квартэта выступалі Тацяна Алісевіч, Тацяна Жаўнова, Вера Епімашка і Марына Малашыцкая. Гэта другі поспех беларусак у розыгрышах Кубка. Аналагічнае свята было ў нас у Суперлізе Кубка кантынента ў 1996 годзе.

1. **Іван Ціхан** (лёгкая атлетыка). На першынстве Беларусі гродзенец некалькі разоў абнавіў рэкорд краіны, урэшце закінуўшы молат на 86 м 73 см. Гэта другі вынік у гісторыі гэтага віду спорту (!!!) і толькі на сантыметр менш сусветнага рэкорда, які належыць Юрыю Сядых і трымаецца ўжо 19 гадоў. Выдатна выступаў у ліпені і Вадзім Дзевятоўскі.

2. **Павал Крывіцкі** (лёгкая атлетыка). Яшчэ адзін гродзенскі малатабоец выйграў моладзевы чэмпіянат Еўропы (век удзельнікаў да 23 год).

3. **Дзмітрый Лапкес** (фехтаванне). Шабліст з Мінска выйграў срэбра на турніры Гран-пры ў Тэгеране. У агульным выніку Кубка свету Лапкес стаў другім, што не ўдавалася ў навейшай гісторыі нікому з беларусаў. Прыкра толькі, што Лапкесу ніяк не ўдаецца выбіцца ў прызёры на галоўных турнірах года — 4-е месца на алімпіядзе, 6-е — на чэмпіянаце Еўропы.

4. **Аляксандр Пархоменка** (лёгкая атлетыка). Наш дзесяціборац выйграў Кубак Еўропы ў другой лізе, істотна паспрыяўшы агульнакамандаваму першаму месцу зборнай Беларусі.

5. **Дзяніс Сілкоў** (плаванне) на чэмпіянаце свету па водных відах на дыстанцыі 50 м брасам устанавіў нацыянальны рэкорд. Аднак яго выніку не хапіла нават для таго, каб трапіць у паўфінальны заплыў — такія цяпер хуткасці.

1. **Тацяна Алісевіч** (лёгкая атлетыка). 36-гадовая мнагаборка паказала найлепшы індывідуальны вынік і выцягнула нацыянальную дружыну на „золата". Прыгадаем з даўніны, што Тацяна была ў складзе пераможнага квартэту і дзевяць гадоў таму.

2. **Кацярына Карстан** (акадэмічнае веславанне) выйграла і апошні этап Кубка свету ў швейцарскім Люцэрне і ўпэўнена перамагла ў агульным заліку.

4. **Вольга Цандар** (лёгкая атлетыка) спярша стала чэмпіёнкай краіны ў кіданні молата, а потым упэўнена выйграла мемарыял Мячэслава Аўсяніка. На турніры памяці выдатнага беларускага трэнера гродзенка ўсталявала новы нацыянальны рэкорд — 76 м 66 см. Гэта таксама другі вынік у сусветнай гісторыі (!).

4. **Вікторыя Азаранка** (тэніс) у пары з венгеркай Агнеш Шаваі выйграла парны разрад юніёрскага спаборніцтва на Уімблдонскім турніры. Гэта ўжо другая перамога ўзыходнай зорачкі на юніёрскіх турнірах Вялікага шлему (да гэтага была вікторыя ў Аўстраліі).

5. **Вольга Гаева** (веласпорт) была названая лепшай маладой раварысткай прэстыжнай шматдзённай гонкі „Джыра д'Італія".

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Дзень без палітыкі*

*Гродзенскі тралейбус затармазіў недалёка ад Фарнага касцёла. Затармазіў так раптоўна, што перапоўнены тралейбус апусцеў роўна напалову. Зад аказаўся вольны. Праўда, спераду пасажыры з цяжкасцю адрознівалі чужыя локці ад сваіх каленяў, але гэта мала каго турбавала. Галоўная задача для кожнага была простай: як паспець выслізнуць з тралейбуса да таго, як ахвотныя ў яго папасці не пачнуць сцэнку штурму Бастыліі. Сяржуку з Міколам пашанцавала. Натоўп, які пакідаў тралейбус у некалькі разоў хутчэй ад пасажыраў „Тытаніка", вынес іх на цэнтральную плошчу горада. Трохі балелі бакі, але хлопцы ўсё адно былі шчаслівыя. Яны вырашылі зрабіць за некалькі апошніх год хоць адзін дзень адпачынку ад палітыкі. Недзе, зусім недалёка, збіралася кааліцыя аб'яднанай апазіцыі „Пяцёрка плюс". Ці можа „Дзесятка плюс". Яна і сама не ведала як зараз называецца. Неістотна. Мікола з Сяржуком вырашылі пражыць гэты дзень як звычайныя грамадзяне, што і не падазраюць пра наяўнасць нейкіх там палітычных кааліцый. Пражыць хоць дзень без пасяджэнняў, мітынгаў, пікетаў, затрыманняў, судоў... Яны проста шпацыравалі па вуліцах старадаўняга Гродна і адкрывалі для сябе наноў даўно забыты свет. Свет, дзе ты ідзеш і не баішся, што за табой сочаць. Што праслухоўваюць твой тэлефон (хлопцы адключылі мабільнікі). Што зараз нехта з заклапочаным тварам пачне камментаваць новы ўказ прэзідэнта... Праўда, час ад часу ў галаву нахабна, нібы рэкламны ролік, лезлі непатрэбныя пытанні, кшталту: „Куды гэта ідуць людзі, якім не трэба на партыйны сход?", але апазіцыянеры на вакацыях стараліся выкідваць гэтыя думкі. Яны проста адпачывалі. Каля пельменнай купілі па шклянцы мінеральнай вады, зайшлі ва ўнівермаг, паглядзелі на кошты тавараў, якіх даўно не ў стане набыць.*

*— Ой, як добра! — з захапленнем уздыхнуў Мікола. — Жывуць жа людзі, як авечкі, і ні пра што не думаюць. Ніякіх праблемаў, акрамя як дзе ўзяць грошы. Толькі мы ўсё са скуры вылазім. Свабоду слова нам давай, правы чалавека...*

*— Ні слова болей, — абурыўся Сяржук. — А то я табе рэзну мацней чым АМАПавец на дэманстрацыі. Дамаўляліся пра палітыку не гаварыць.*

*— Прабач мне, дурню, — пагадзіўся Мікола. — Само вырвалася. Сёння размаўляем толькі пра кошты на каўбасу і дзе лепшыя лецішчы. А яшчэ, як апошні раз перапілі і колькі нашы жонкі пасля гэтага з намі не размаўлялі. І трошкі пра кепскіх начальнікаў на працы і пра тое, як яны несправядліва зразаюць прэміяльныя. Словам, будзем гаварыць толькі пра тое, пра што іншыя людзі.*

*— Так-так, — весела падтрымаў таго Сяржук. — І трошкі пагаворым пра цешчаў, трошкі пра несправядлівых і хцівых жончыных сваякоў, зусім крыху пра вальнутага кіроўцу тралейбуса, і трошкі больш пра планы рамонту левага люстэрка ў сваёй машыне. І пап'ем піва. Можа нават булькнем у бакал сто грамаў гарэлкі. Зробім ёршык. Ці ўжо людзі ёршыкаў не робяць?*

*— Не ведаю. Даўно з нармальнымі людзьмі не выпіваў. Усё толькі з палітыкамі... Маўчу-маўчу. Прабач, вырвалася. А давай пойдзем да бара „Віленскі". Там і пап'ем піва як іншыя. Што яны будуць піць, тое і мы.*

*Павярнуўшы на рагу Савецкай і Ажэшкі налева, хлопцы апынуліся перад барам „Віленскі". Адтуль якраз выйшлі музыкі, каб граць на вуліцы, на пляцоўцы перад барам. Вакол музыкаў, як парасяткі вакол свінаматкі, стаў збірацца натоўп. Хлопцы пасунуліся туды таксама. Але праз хвіліну іх хтосьці хапіў за рукі і павалок назад. Апазіцыянеры павярнулі галовы. Іх моцна трымалі супрацоўнікі міліцыі. Неўзабаве падляцеў і старэйшы афіцэр.*

*— Я патрабую спыніць несанкцыянаванае мерапрыемства, — рашуча заявіў ён. — Калі вы не падпарадкуецеся законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі, то будзеце затрыманыя.*

*— Якое мерапрыемства? — здзівіўся Сяржук. — Мы проста адпачываем.*

*— А хто па-вашаму тут сабраў столькі людзей? — не супакойваўся афіцэр.*

*Хлопцы так зарагаталі, што міліцыянты адразу зразумелі сваю памылку.*

*— Ну кантора! — праз зубы выцадзіў афіцэр. — Зусім працаваць не ўмеюць. Далі нам наводку, што вы збіраеце мітынг. А тут проста музыка.*

*Ён гнеўна кінуў позірк на чалавека ў цывільным, які няўмела хаваў за пазухай рацыю і ў якім хлопцы пазналі пасажыра тралейбуса, што стаяў побач з імі. Той глянуў яшчэ на аднаго, што таксама каля пельменнай заказваў шклянку мінеральнай вады, якраз тады, калі яе пілі Мікола з Сяржуком. Гэты чалавек толькі разгублена пацісnуў плячамі і знік у натоўпе. Міліцыянты таксама паспяшаліся прапасці.*

*— Ну што, — запытаўся Сяржук у сябра. — Не ўдаецца нам адпачыць ад палітыкі. Колькі зараз часу?*

*— Яшчэ пасяджэнне „Пяцёркі плюс" не скончылася. Трэба ісці туды. Можа хлопцы нас чакаюць.*

*І яны шпарка пакрочылі па вуліцы Ажэшкі, каля бліскучых вітрынаў бараў, людзей з бутэлькамі піва і проста адпачываючых кампаній. За іх плячамі, каля бара „Віленскі" зайграла музыка і весела запішчаў натоўп. Але яны, штосьці сур'ёзна абмяркоўваючы, гэтага ўжо не пачулі.*

**Генрых Спадашмянскі**

# Ткалі рарытэты

**Мастацтва ткацкага рукадзелля прамінула ў нас бадай у геркаўскую эпоху. Тадышні бум закружыў і гарадамі, і вёскамі, быццам смерч высмоктваючы з апошніх маладыя кадры патэнцыйных наследніц даўнейшых майстрых. Ды і грошы, якія тады таксама не мінулі вёскі, спрацавалі ў карысць лёгка даступных купных вырабаў, спіхаючы працаёмкія даматканыя ў пасажныя скрыні.**

— Спачатку я ткала палатно, мяшкі, палавікі, — кажа Людміла Турко з Візгаў, што ў Кузніцкай гміне. — Села я за кросны яшчэ да пятнаццаці гадоў. Мая мама крыху хварэла і мне давялося замяняць яе пры забеспячэнні сям'і тканінай. Недзе ў васемнаццаць гадоў стала брацца за капы. Узоры бралі жанчыны адны ад другіх, і так вучыліся. У сваёй роднай вёсцы, Снічанах, што каля Сідры, я на вузкіх кроснах ткала палавіны кап, якія пасля трэба было сшываць. Калі прыйшла ў Візгі замуж, набыла я шырокія кросны з шырокім бёрдам і ўжо магла ткаць шырокія тканіны. Спярша аснову, льняную, купляла ў крамах, а воўну на вуток рыхтавала сама; пасля ткала і суканыя капы, з самой воўны. У краме ў Сакольцы — яна хіба і сёння там ёсць — купляла я фарбы і сама моткі фарбавала. Першыя капы ткала толькі сабе, а пасля стала ткаць і суседзям. Нават са Снічан прыязджалі да мяне, каб выткала ім капы. Яны мне дастаўлялі свой матэрыял, я ім прапанавала ўзоры. Мне толькі плацілі за работу. А цяпер то я ўжо і красён не маю — на дровы пайшлі, а шырокае бёрда яшчэ хіба на гарышчы ляжыць, калі яго іржа не пераела.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Валянціна Мальчык з Людмілай Турко (справа) на капе, вытканай першай на кроснах другой*

Валянціна Мальчык, нягледзячы на знемагаючы боль суставаў, з-за якіх праз тыдзень ляжа ў шпіталь, паказвае прыхаваныя свае самаробкі. Бо боль душы, якую яна ўклала ў карпатлівую працу дзеля ўпрыгожання свайго быту, большы за той цялесны:

— Я пад суседчыным наглядам выткала на яе кроснах бадай з сем кап, — кажа спадарыня Мальчык. — Думала: дочкам дам. І калі выходзілі замуж, дала ім у пасаг. А яны мне іх папрывозілі назад; у горадзе, кажуць, ім непатрэбныя. І ляжаць у куфэрку, перакладзеныя лучынай, каб моль не паела.

Адносіны выхадцаў з нашых вёсак да бацькоўскага рукадзелля такія ж, як і да ўсялякай іншай спадчыны. І яна паволі і незаўважна становіцца рарытэтам. А рарытэт набывае цану, становіцца модным, так як колы для жалезнякоў, якія сёння ўпрыгожваюць шматлікія новыя вілы. На аздобу хатняга інтэр'ера вырабамі вясковага ткацкага рукадзелля яшчэ не настала мода. У гарадскіх блёках няма месца на такія нямодныя цяпер спальні, у якія засцілалі калісь саматканыя капы. Яшчэ ў модзе „версалькі" і „амерыканкі", упрыгожаныя фабрычнай абіўкай. Але хіба не за гарамі той час, калі мода „рэтра" заглянe і ў старыя куфэркі за пасажнымі каштоўнасцямі.

**Аляксандр Вярбіцкі**

## У Ясянёўцы

Новае, сімпатычнае мерапрыемства завялося нам у гміне Дзядковічы. Гэта конегадоўчая выстава ў Ясянёўцы, якая ладзілася сёлета, 10 ліпеня, ужо другі раз. У параўнанні з мінулагоднім, якая ахоплівала толькі каняводаў з Сямятыцкага павета, сёлетняя была пашырана на паказ найпрыгажэйшых прадстаўнікоў гэтых жывёл таксама з суседніх паветаў: Бельскага і Гайнаўскага. І трэба прызнаць, што добра сталася, бо большая канкурэнцыя ставіць перад жывёлаводамі вышэйшыя патрабаванні, а жыхары нашых трох паветаў атрымалі магчымасць паказаць вынікі сваёй працы. І акрамя гэтага, завялося цікавае мерапрыемства, якое прыцягнула тысячы людзей і дазволіла ім правесці тую нядзелю ў атмасферы радаснага сямейнага і сяброўскага пікніка.

Прэзентаваліся, галоўным чынам, коні халоднакроўных парод. У ліку некалькіх дзесяткаў каняводаў былі м.інш. Васіль Саўчук з Бельска, Мікалай Васілюк з Гайнаўкі, Ян Зенюк з Зубава, Павел Страпчук з Тымянкі, Юры Скепка з Забрадоў каля Нараўкі, Яўген Федарук з Бялок каля Мілейчыч... З гэтага ліку спадар Мікалай Васілюк вярнуўся дахаты з кубкам і ўзнагародай за паказаную адзінаццацігадовую халоднакроўную кабылу Балю. З шасці штук яе патомства палову (адну кабылу і двух жарабцоў) занесена ў кнігу разводных коней. **(мц)**

## Свая праўда

У 28 н-ры „Нівы" ад 10 ліпеня г.г. Мікалай Панфілюк у допісе „Карэспандэнты" так піша: „Мікалай Лук'янюк падзяліў ніўскіх карэспандэнтаў на дзве катэгорыі: на найлепшых і менш лепшых. Што ж, гэта праўда, бо язык у адных ходзіць як на пружыне, гаворка ідзе гладка як у адваката і такое аратарства пераважна аснавана на хлусні. А ў іншага язык так гладка не ходзіць, яго мова няскладная, але ў ягонай гутарцы больш рацыі і праўды. І каторы з іх больш вартасны і лепшы?" Далей аўтар спасылаецца на словы былога галоўнага рэдактара Георгія Валкавыцкага, які: „... павучаў нас, каб мы заўсёды пісалі праўдзіва, талкова і ад сэрца...".

Вось, што Вам скажу паважаны М. Панфілюк. У вашым допісе не бачу ні ладу, ні складу. Па-першае — робіце закід Лук'янюку, што падзяліў карэспандэнтаў на лепшых і горшых. Вы дзеліце на свой спосаб: на ілгуноў і тых, што пішуць праўду. Ці не так? Дык хачу запытаць шаноўнага аўтара, да якой катэгорыі сябе залічыў? Па-другое. Спадар Панфілюк рабіў такую ж ацэнку раней на старонках „Нівы". А наконт цытаты Г. Валкавыцкага: пагаджаюся з вамі, спадар Панфілюк. Трэба пісаць праўдзіва, талкова і ад сэрца.

**Уладзімір Сідарук**

## Экуменізм

У „Ніве" н-р 27 ад 3 ліпеня г.г. прачытаў я артыкул п.з. „Прадузятая боязь" Віталя Лубы і моцна над ім задумаўся. Праўду кажучы, Бог Айцец, Бог Сын і Святы Дух з'яўляецца ў адной Асобе — так нас навучаюць святары і так апісана ў Святым пісанні. Але тут, на зямлі, ёсць многа веравызнанняў і ўсе, як хто ўмее, моляцца да аднаго Бога — так мне сказаў каталіцкі святар, калі пабачыў мяне на богамаленні ў шпітальнай капліцы. Потым спаткаў мяне на калідоры і спытаўся, чаму я, праваслаўны вернік, прыйшоў на каталіцкую імшу? Калі я адказаў святару, што ў маёй блізкай і далейшай сям'і ёсць пяць розных веравызнанняў і з усімі я жыву ў згодзе, тады ксёндз паказаў пальцам угару і сказаў, што там ёсць толькі адзін Бог. Але не ў тым справа. Тут ходзіць мне аб супрасльскія катакомбы, якія нішчэюць




і да гэтай пары не мелі законнага гаспадара, хоць у сапраўднасці былі яны ад пачатку праваслаўнымі, толькі перайшлі пад уладанне уніятаў, якія адламаліся ад Праваслаўя пад прыгнётам і прынялі ўсходняе каталіцка-грэчаскае веравызнане.

Рашэннем Рэгуляцыйнай камісіі па справах Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, якая дзейнічае пры Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі супрасльскія катакомбы маюць ужо прававітага гаспадара і будуць рамантаваны згодна з наказам архітэктара. Па меры магчымасці будуць яны даступнымі ўсяму грамадству, не толькі хрысціянам — праваслаўным і католікам — але таксама мусульманам і іншым веравызнанням. Праваслаўныя святары не абмяжуюць нікому доступу да катакомбаў.

Цяпер часта адпраўляюцца ў цэрквах і касцёлах экуменічныя набажэнствы, у час якіх святары розных канфесій намаўляюць хрысціян да паяднання. Пасля набажэнства тыя ж святары засядуць за адным сталом за чаркай віна і супольна гутараць, быццам то ў добрай веры аб паяднанні, але калі яны разыдуцца — у кожнага іншая думка і тады муцяць сваім „авечкам" у галовах, кляймуючы адзін аднаго.

Мне здаецца, што аб мінулым катакомбаў у Супраслі добра ведае мясцовы каталіцкі ксёндз, як і праваслаўныя святары і павінны выказаць праўду сваім прыхаджанам ды пагутарыць з нефартуннымі райцамі Супрасльскага самаўрада, каб яны не дзялілі людзей на лепшых і горшых.

**Мікалай Лук'янюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 003 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Выпадак

*У горадзе Краёва, што ў Румыніі, здарыўся дарожны выпадак: адна машына трахнула ў другую. Выпадак, здаецца, звычайны, бо ж мабільныя сутыкненні здараюцца хіба нават і ў космасе. І як жа часта іх прычынай з’яўляецца розная прывабнасць, напрыклад, стаканчык напоўнены мілавіднай вадкасцю. Асабліва мы, славяне, любім раскашавацца такімі ласункамі нейтральнага або лёгка сіваватага колеру. Румыны, гэта па сутнасці таксама славяне, толькі раманізаваныя. У выпадку, пра які згадка, прычынай зацямнення вадзіцеля было, аднак, уздзеянне іншай шпоры.*

*Вадзіцелем быў 19-гадовы Роберт Філіп, а ягонай пасажыркай на год малодшая Андрэя Папеску. Ужо з самога як жа райскага пачатку чалавецтва вядома, што ад кабеты нельга спадзявацца нічога добрага, што яе цікавасць, гэта першая ступенька ў няшчасце. Так было і гэтым разам, бо дапытлівая пасажырка стала ў ходзе язды практычна цікавіцца, як будзе рэагаваць анатомія вадзіцеля на ўздзеянне ейнай анатоміі. Чым яна ўздзеяла, тут не паведамлю, каб не дражніць нашага традыцыяналістычнага чытача празмерным мадэрнізмам. Заўважу адно, што тая шпора была рэзкая, як бабскі язык, які скарэй можа загнаць на кручок, чым завесці ў Кіеў.*

*Вось тое небяспечнае ўздзеянне выклікала ў Роберта такое зацямненне нервовай сістэмы, якое паралізавала неабходную для язды ўвагу і прывяло да сутычкі з іншым самаходам. Удар быў, на шчасце, настолькі памяркоўны, што названы раней экіпаж нават не спыніў сваіх практыкаванняў і прыбегшыя на месца здарэння разявакі ды прыехаўшая паліцыя засцігглі яго ў яшчэ зусім недвухсэнсавых абставінах.*

*Калі на месца нейкага выпадку з’яўляецца паліцыя, тады трэба ўсяго спадзявацца, а найперш за ўсё адказнасці — і за язду пад уплывам недазволеных стымулаў, і за прычыненыя шкоды. А ў Румыніі ж законы строгія! Тут жа юрыдычную традыцыю стварыў слаўны князь Улад, названы ў легендах Дракулам ці Дракулай... Юрыдычная ж традыцыя, як вядома, сягае біблейскіх запаведзей і кодэкса цара Хамурапі, дзе вокам трэба было расплачвацца за вока, зубам за зуб, а за пакражу — для засцеражэння ад спакусы — абрэзвалі руку...*

*Старыя юрыдычныя нормы не прадбачвалі аўтамабільных практыкаванняў і захаванне суровай традыцыі прымушала б да нейкай вынаходлівасці ў адносінах да таго атрыбута, які спрычыніў выпадак. У гэтым плане кемлівыя румынскія юрысты маглі б спаслацца на адзін старазапаветны гігіенічны абрад і прымяніць яго ў крайне рашучым варыянце. Паколькі дзея адбывалася ва Усходняй Еўропе, дзе практыкавалася класавае змаганне, да адказнасці, апрача вадзіцеля, маглі б у гэтым выпадку прыцягнуць і ягоную падбухторшчыцу. І бедная маладая пасажырка магла б патраціць не толькі сваю рэзкую шпору, але ў крайнім выпадку і расплаціцца галавою.*

*Нічога, аднак, дрэннага не сталася, бо адвакат абвінавачанага прывёў вельмі перакана́ўчы аргумент:*

*— Мой кліент каецца за тое, што сталася, але ён у тых абставінах сапраўды не мог вырвацца з кіпцюроў страсці. І паверма ўсе, што грошы на кампенсацыю прычыненай шкоды і адабранне на 90 дзён вадзіцельскага білета будуць яму дастатковай навукай на будучыню.*

*Мы, тутэйшыя, можам круціць носам, што такі выпадак немагчымы. Аднак у гэтым месцы трэба прыгадаць, што румынскія гімнасткі прыглушылі славу нават нашай Вольгі Корбут. А дарога ж у вялікі спорт вядзе шляхам менавіта цалкам элементарных практыкаванняў.*

**(івар)**



Фота ЯНА МАЛЬЦА

# „Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Коля вяртаецца з бацькоўскага сходу ў школе. Жонка распытвае яго:

— І што гаварыла настаўніца пра поспехі нашага сынка?

— Што гаварыла, што гаварыла? Гэта ўся твая сутнасць! Пасылаеш мяне на сход, а забываеш сказаць, у каторым класе наш сынок вучыцца!

* * *

Студэнт пытае свайго дзедка:

— Што вы, дзедку, усё так чытаеце і чытаеце?

— Рыхтуюся да апошняга экзамену ў жыцці.

* * *

Перапынак на ланч. Чыноўнік разгортвае бутэрброд. Глядзіць з абурэннем на хлеб з варэннем і выкідае ў сметнік. На другі дзень карціна паўтараецца. На трэці дзень вымае яду і кідае яе ў сметнік нават не разгортваючы.

— Чаму не праверыш, што там загорнута? — пытае сябра. — Можа сёння ў цябе хлеб з каўбасою?

— З варэннем!

— Адкуль ведаеш?

— Бо сам гатовіў.

# Адгаданка



1. гарадскі пасёлак пры ўпадзенні Сожа ў Дняпро, 2. Ян, беларускі кампазітар з Сакольшчыны (1889-1961), 3. праём у сцяне з рамамі са шклом, 4. мужчынскі голас, 5. мангольскі ўладар, 6. горад у Пскоўскай губерні між Полацкам і Вялікімі Лукамі, 7. вялікая сібірская рака, 8. гарачая крыніца вулканічнага паходжання, якая выкідае ваду фантанам, 9. тонкі слой ледзяных крышталяў на ахаладжанай паверхні прадмета, 10. Уладзімір, беларускі паэт (1900-1933), 11. брат Авеля. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — народная прыкмета.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 26 нумара**

Сон, Кракаў, мат, амлет, рог, мноства, ягада, мора, маг, ом, агрэст, Конга, мыш, плашч, Тамбоў, прыгон. Рашэнне: **Многа камароў — многа ягад, многа мошак — многа грыбоў.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

# 07.08 – 13.08

**Баран (21.03. — 19.04.)** З 12.08. твая інтуіцыя беспамылковая, асабліва наконт выдавання грошай. Дарэчы, толькі яны могуць быць для цябе пасткай. Будзеш выбіраць, што лепш — рандэву ці цікавая здзелка!

**Бык (20.04. — 20.05.)** Пазбягай падазронасці, зайздрасці і няслушных абвінавачванняў партнёра; можа гэта вельмі некарысна адбіцца на будучыні вашай пары. Грошы проста лепяцца да цябе!

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Квадратура Марса да Нептуна паўплывае на тое, што будзеш раздражнены, надта ўзбуджаны, сварлівы. Можаш сказаць словы, якіх пасля будзеш шкадаваць. Замест скрываць эмоцыі, актыўна іх разрадзі.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Дамаўляйся на дыскусіі аб сваіх праблемах; развязка акажацца быць вельмі простай. Ракі з 2 — 12.07. могуць прабаваць парывацца з матыкай на сонца; памылка можа вас шмат каштаваць.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Будзе горача! Можаш сустрэць каханне свайго жыцця! Распаліш пагаслыя жарсці. Маеш шанц зрабіць кар’еру і здабыць патрэбныя грошы. Можаш зрабіць паважныя змены ў жыцці; найлепшы час — 12 — 16.08. Да 10.08. ты вельмі падатлівы на некарысны ўплыў атачэння.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** 11 — 15.08. — небяспекі ў падарожжы, пазбягай хуткай язды і бравурнасці! Заробкі могуць узрасці, але задавальненне з працы ідзе на спад.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Квадратура Венеры да Плутона прадбачвае клопаты, якія вынікнуць з тваe разлезласці альбо неахвоты прызнацца да памылкі. Не разграшай дробных ашуканстваў і падманаў, бо хтосьці, каго кахаеш, моцна цябе параніць.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Любоўныя розыгрышы нечакана могуць змяніцца ў заядлыя змаганні. Будзь разумнейшы — уступі! Зоркі вельмі спрыяюць у прафесійных планах. З 12.08. (па 16.08.) твая сіла нязломная і непераможная. 8 — 12.08. шэраг клопатаў з партнёрам, з якім замест змагацца — дагаварыся.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Да 8.08. добрае падарожжа, афармленне юрыдычных спраў. Не забывай аб прозе жыцця, асабліва аб неаплачаных рахунках.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Тваё ўпарадкаванае жыццё можа разбурыць шалёнае каханне. Не ўцякай ад яго! Асцерагайся ашуканцаў і круцялёў. І незашмат аддавай кар’еры.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** З 9 па 13.08. захопіш партнёра спантаннасцю і шалёнымі ідэямі. З 12.08. будзеш дзіка адважны і вельмі прадпрымальны. Шмат можа табе ўдацца, толькі не расчульвайся над сабою. Да 9.08., замест займацца сабою, будзеш мець ахвоту памагаць іншым, хто гэтага ў цябе не просіць.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Калі ўжо вы забылі, што такое жарсная любоўная прыгода, можаце перажыць яе яшчэ раз! У фінансавых справах не кіруйцеся ніякай інтуіцыяй. Да 10.08. будзеце схільныя да нерэальных чаканняў альбо паддавання сябе ўплывам іншых. Неблагі настрой.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960